# НАДЗЕЛА ТАМАША
## (Антыпасха)

## ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 1*). Дзьверы, дзе сабраліся вучні, былі зачыненыя, калі Ты, Усемагутны Ісусе, Божа наш, неспадзявана стаў сярод іх і сказаў: "Мір вам." І напоўніліся яны Духам Сьвятым. Ты загадаў ім заставацца ў Ерусаліме, пакуль не атрымаюць сілы з вышыні. Дзеля гэтага славім Цябе і пяем: "Прасьвятленьне, уваскрасеньне і супакой наш, слава Табе!"

На восьмы дзень пасьля ўваскрасеньня Твайго, Госпадзе, Ты зьявіўся сабраным вучням Тваім і сказаў: "Мір вам." Вучню, які раней не паверыў, Ты паказаў свае ўсячыстыя рукі і бок. Упэўніўшыся, той усклікнуў: "Госпад мой і Бог мой. Слава Табе!"

Калі Ты ўвайшоў праз зачыненыя дзьверы, Тамаш, празваны Блізьнюком, ня быў з іншымі вучнямі і таму не паверыў, калі яму пра гэта сказалі. Каб перамяніць ягонае няверства на веру,Ты, Міласэрны, дазволіў яму дакрануцца да ўсячыстага боку Твайго і да ранаў на руках і нагах. Уклаўшы руку сваю ў раны Твае, ён упэўніўся, што Ты ня прывід і не звычайны чалавек і, вызнаўшы Цябе як Бога, усклікнуў:"Госпад мой і Бог мой. Слава Табе!"

На восьмы дзень зьявіўся Збавіцель сабраным вучням, што ўсё яшчэ сумняваліся, і, прывітаўшы іх, сказаў Тамашу: "Хадзі, апостале, дакраніся да далоняў, прабітых цьвікамі!" О шчасьлівае няверства Тамаша, што змусіла яго ў страху ўсклікнуць і разагнаць сумненьні ў сэрцах верных: "Госпад мой і Бог мой. Слава Табе!"

(*Тон 2*). Пасьля ўваскрасеньня Твайго, Госпадзе, калі сабраліся вучні і дзьверы былі зачыненыя, Ты стаў сярод іх, даючы ім супакой. Агледзеўшы Твае рукі і бок, Тамаш паверыў і вызнаў Цябе як Госпада і Бога, і Збаўцу тых, што спадзяюцца на Цябе, Чалавекалюбча.

Пры зачыненых дзьвярох стаў Ісус сярод вучняў і даў ім мужнасьць і супакой. Ён сказаў Тамашу: "Чаму ня верыш, што Я ўваскрос з мёртвых? Дай руку тваю і ўкладзі яе ў Мой бок, каб праз няверства тваё ўсе дазналіся пра Мае цярпеньні і ўваскрасеньне, і каб з табою ўсклікнулі: Госпад мой і Бог мой, слава Табе!"

Слава... цяпер...

(*Тон 6*). Хоць дзьверы былі зачыненыя, Ты, Хрысьце, прыйшоў да вучняў Тваіх. Тамаш тады ня быў разам з імі, і таму ён, прыйшоў-шы, сказаў: "Не паверу, пакуль не пабачу Уладара, і не дакрануся да Ягонага боку, з якога пацякла кроў і вада хросту; і ранаў, якія вылечылі чалавека ад вялікай раны граху, і не пераканаюся, што гэта ня быў дух, але меў цела і косьці." Госпадзе, які перамог сьмерць і Тамаша да веры прывёў, слава Табе!

**Ліцьця**

(*Тон 4*). У нясьцерпным зьзяньні Боскасьці Ты, Госпадзе, увайшоў праз зачыненыя дзьверы і, стаўшы сярод вучняў, паказаў ім бок Твой і струпы ад ранаў на руках і нагах. Ты адмяніў іхні сум і жаль, і ўсклікнуў голасна: "Я ня прывід, вы бачыце Мяне ў целе." Вучню, які сумняваўся, Ты загадаў дакрануцца да Цябе, і сказаў: "Пераканаўшыся, ідзі і больш не сумнявайся." Ён дакра-нуўся рукою да Тваёй падвойнай прыроды з вераю і ў страху ўсклікнуў: "Ты — Госпад мой і Бог мой: Слава Табе!"

(*Тон 8*). "Дакраніся, Тамаш, да Майго боку — кажа Хрыстос, — і агледзь раны ад цьвікоў: вераю дасьледуй і будзь верным, а не няверным." Тамаш дакрануўся да Ўладара і голасна ўсклікнуў: "Ты, Добрасардэчны, — мой Бог і Госпад. Слава Табе!"

Слава... цяпер...

(*Тон 8*). Збавіцель прыйшоў пры зачыненых дзьвярох да сабра-ных вучняў і, стаўшы сярод іх, сказаў Тамашу: "Хадзі, пабач знакі ад цьвікоў, працягні руку і дакраніся да боку Майго, і ня будзь няверным, але вер і прапаведуй Маё ўваскрасеньне з мёртвых!"

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). Слаўны цуд! Няверства нарадзіла непахісную веру. Тамаш сказаў: "Не паверу, пакуль не пабачу!." Ён дакрануўся да боку Ўцелаўлёнага і праславіў Яго як Сына Божага, бо пазнаў Таго, хто целам пацярпеў. Ён вызнаў Яго як уваскрослага Бога і ўсклікнуў узрушаным голасам: "Госпад мой і Бог мой. Слава Табе!"

*Верш.* Хвалі, Ерусаліме, Госпада; слаў Бога твайго, Сыёне.

Слаўны цуд! Сена дакранулася да агню і засталося цэлым! Тамаш уклаў руку ў рэбры Ісуса Хрыста-Бога, быццам у вагонь, і не згарэў, але, усхваляваны, перамяніў няверства на веру непахісную і ўсклікнуў з глыбіні душы: "Ты мой Уладар і Бог, які ўваскрос з мёртвых. Слава Табе!"

*Верш.* Бо Ён умацаваў замкі варотаў тваіх, і благаславіў у табе сыноў тваіх.

Слаўны цуд! Ян прыхіліўся да грудзей Збавіцеля, Тамаш удас-тоіўся дакрануцца да Ягонага боку; першы з іх атрымаў разуменьне глыбіняў багаслоўя; другі стаўся годным прапаведнікам тайны і даў нам доказ Ягонага ўваскрасеньня, калі ўсклікнуў: "Госпад мой і Бог мой! Слава Табе!"

Слава... цяпер...

(*Тон 5*). Вялікае і бяспрыкладнае багацьце міласэрнасьці Тваёй, Чалавекаюбча! Ты паказаў Тваю доўгацярплівасьць, калі мучыцелі Твае білі Цябе па твары, вучань дакрануўся да Цябе, а недаверкі выпытвалі Цябе, як гэта Ты прыняў цела і як, сам бязгрэшны, быў укрыжаваны. Настаў нас на розум, як некалі Тамаша, каб нам усклікнуць: "Госпад мой і Бог мой! Слава Табе!"

**Апушчальны трапар**

(*Тон 7*). Хоць магіла была запячатаная, Ты, Хрысьце Божа, зазьзяў з магілы; і хоць дзьверы былі зачыненыя, Ты, Уваскрасеньне ўсіх, прыйшоў і стаў сярод вучняў Тваіх, абнаўляючы ў нас праз іх дух правы ў вялікай міласэрнасьці Тваёй. (*Тройчы*).

## ЮТРАНЬ

**Трапар** *(тон 7).* Хоць магіла была запячатаная... (*Тройчы*)

**Першая сядальная песьня** *(тон 1).* Да вучняў, якія ў страху перад гэбрэямі сабраліся на Сыёне, Ты, Добры, прыйшоў праз зачыне-ныя дзьверы і прынёс ім радасьць. Ты паказаў ім Твае рукі і бок і сказаў вучню, які ня паверыў: "Працягні руку тваю, дакраніся і пераканайся, што гэта Я, які за цябе пацярпеў." (*Двойчы*)

**Другая сядальная песьня** *(тон 1).* Хоць дзьверы былі зачыненыя, Ты, Жыцьцё ўсіх, Хрысьце, стаў сярод вучняў Тваіх, паказаў ім Твае рукі, ногі і бок і ўмацаваў іх у веры Твайго ўваскрасеньня. Але Тамаш, які ня быў з імі, сказаў: "Калі не пабачу Яго, не паверу таму, што кажаце." (*Двойчы*)

**Сядальная песьня пасьля палielею** *(тон 1).* "Бачыш, Тамаш, мой бок і раны ад цьвікоў, дык чаму ня верыш?" — сказаў Госпад, калі паказаўся апосталам пасьля свайго ўваскрасеньня. І Тамаш уверыў і ўсклікнуў Творцу: "Ты мой Бог і Госпад!"

**Узыходныя песьні**: *Першы антыфан 4 тону.*

**Пракімен.** Хвалі, Ерусаліме, Госпада; слаў Бога твайго, Сыёне.
*Верш.* Бо ён умацаваў асновы варотаў тваіх, і блаславіў у табе сыноў тваіх.

**Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле Мацьвея**

У той час адзінаццаць вучняў пайшлі ў Галілею на гару, куды сказаў ім Ісус. І, убачыўшы Яго, пакланіліся Яму, а іншыя ўсумніліся. Тады Ісус падышоў і зьвярнуўся да іх з наступнымі словамі: "Дадзеная мне ўся ўлада на небе і зямлі. Дык ідзіце, навучайце ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, і вучыце іх захоўваць усё, што Я сказаў вам. І вось Я з вамі праз усе дні аж да сканчэньня сьвету.Амін." (*28: 16-20*)

***Пасьля Евангельля***: Убачыўшы ўваскрасеньне Хрыстова... *І ўсё, як у нядзелю.*

**Канон**
(Тон 1)

**Песьня 1.** *Ірмас.* Усе народы, сьпявайце пераможную песьню Таму, хто вызваліў Ізраіля з фараонавай няволі, бо Ён праславіўся.

Сёньня вясна нашых душаў, бо Хрыстос устаў, быццам сонца, з магілы на трэці дзень і разагнаў зіму грахоў. Дык пяем Яму, бо Ён праславіўся.

Сёньняшняе сьвята — верны спадарожнік сьветлага Сьвята ўсіх Сьвятаў. Яно цешыць новы выбраны народ царкоўны, які няспынна славіць у песьнях уваскрослага Хрыста.

Ні вароты пякельныя, ні пячаці магільныя, ні зачыненыя дзьверы не змаглі ўтрымаць Цябе, Госпадзе. Уваскросшы, Ты стаў сярод прыяцеляў Тваіх і даў ім супакой, што пераўзыходзіць усякае разуменьне.

*Катавасія:* Уваскрасеньня дзень! Узрадуемся, людзі: сёньня Пасха Госпадняя, Пасха! Бо вось ад сьмерці да жыцьця і ад зямлі на неба Хрыстос Бог перавёў нас, якія пяём песьню перамогі.

**Песьня 3**. *Ірмас.* Умацуй мяне, Хрысьце, на непахіснай скале запаветаў Тваіх і прасьвятлі зьзяньнем твару Твайго, бо ніхто не сьвяты апроч Цябе, Чалавекалюбча.

Ты, Хрысьце, абнавіў нас Крыжом Тваім і, даўшы нятленнасьць замест тленнасьці, загадаў жыць новым жыцьцём.

Замкнёны ў магіле, абмежаваны целам, Ты, бясконцы і ўсемагутны Хрысьце, уваскрос і праз зачыненыя дзьверы прыйшоў да вучняў Тваіх.

Ты захаваў раны, якія Ты атрымаў дзеля нас, і паказаў іх вучням Тваім як доказ Твайго слаўнага ўваскрасеньня.

*Катавасія.* Хадзеце, будзем піць пітво новае, не з каменя бясплоднага цудам атрыманае, але тое, што б'е жывой крыніцай з магілы Хрыста, які нас умацоўвае.

**Іпакоі** *(Тон 2).* Ты, Збавіцелю, прыйшоў да Тваіх вучняў і даў ім жыцьцё. Прыйдзі таксама да нас і збаў нас.

**Песьня 4**. *Ірмас.* Вялікая тайна провіду Твайго, Хрысьце! Авакум прадбачыў яго ў божым відзеньні і ўсклікнуў: "Ты прыйшоў для збаўленьня людзей Тваіх, Чалавекалюбча!"

Пакаштаваўшы жоўці, Хрыстос аздаравіў нашу ранейшую няўстрыманасьць. Цяпер Ён дае праайцу (Адаму), быццам соты мёду, слодыч прасьвятленьня і еднасьці з сабою.

Ты, Чалавекалюбча, цешышся, калі шукаюць Цябе: Дзеля гэтага Ты паказаў Тамашу, які сумняваўся, Твой бок, і такім чынам умацаваў у сьвеце веру ў Тваё, Хрысьце, уваскрасеньне на трэці дзень.

Зачарпнуўшы з Твайго, Дабрачынца, прабітага кап'ём боку невычэрпнае багацьце Боскае мудрасьці, Тамаш напоўніў увесь сьвет разуменьнем.

Хвалім твой, Тамашу, блаславёны язык, якім ты, першы з усіх, набожна аб'явіў усім Жыцьцядаўца Ісуса, Бога і Госпада, пасьля таго, як ты дакрануўся да Яго.

*Катавасія.* На боскай варце Богам натхнёны Авакум хай стане разам з намі і пакажа анёла прамяністага, які нам ясна кажа: Сёньня збаўленьне сьвету, бо ўваскрос Хрыстос усемагутны.

**Песьня 5.** *Ірмас.* Сярод ночы славім Цябе, суспрадвечны з Айцом Хрысьце і Збавіцелю душаў нашых. Дай супакой сьвету, Чалавекалюбча.

Зьявіўшыся сярод зьнявераных вучняў Тваіх, Ты, Збавіцелю, суняў іхні сум і ўваскрасеньнем Тваім напоўніў іх радасьцю.

Сапраўды сьмелы ўчынак годнага пахвалы Тамаша! Ён не збаяўся дакрануцца да боку, які гарэў Боскім полымем.

У Тваёй мудрасьці Ты, Хрысьце, няверства Тамаша зрабіў крыніцаю веры. Ты чыніш усё для нашага дабра, Чалавекалюбча.

*Катавасія.* Устанем рана да сьвітаньня і, замест духмянасьцяў, песьню Ўладару прынясем, і ўбачым Хрыста, Сонца справяд-лівасьці, што асьвятляе ўсім жыцьцё.

**Песьня 6.** *Ірмас.* Ты, Чалавекалюбча, збавіў прарока Твайго з нутра кіта: уздымі і мяне з бездані правінаў, малюся Табе.

Ты, Уладару, ня даў Тамашу патануць у твані няверства, але працягнуў яму рукі свае, каб ён мог агледзець іх.

Госпад сказаў Тамашу: "Дакраніся да мяне і пераканайся, што Я сапраўды той самы і маю цела і косьці."

Тамаш, які ня быў прысутны, калі Ты першы раз зьявіўся вучням, дакрануўся да Твайго боку і, паверыўшы, вызнаў Цябе як нашага Збавіцеля.

*Катавасія.* Ты, Хрысьце, зышоў ў глыбіні падземныя і разьбіў вечныя путы, што трымалі вязьняў, і на трэці дзень, быццам Ёна з нутра кіта, устаў з магілы.

**Кандак** (*тон 8*). Дапытліваю рукою Тамаш дакрануўся да жыцьцядайнага боку Твайго, Хрысьце Божа, калі Ты ўвайшоў праз зачыненыя дзьверы, і разам з іншымі апосталамі ўсклікнуў Табе: "Ты Госпад мой і Бог мой!"

*Ікас.* Хто захаваў непашкоджанай руку вучня, калі Той уклаў яе ў вогненны бок Збавіцеля? Хто даў яму сьмеласьць дакрануцца да палымянай косьці? Несумненна той бок, да якога ён дакрануўся, даў сілу тленнай руцэ дакрануцца да Таго, хто мукамі сваімі скалануў неба і зямлю. Гэтая ласка была дадзеная Тамашу, каб ён, дакрануўшыся да Хрыста, мог усклікнуць: "Ты Госпад мой і Бог мой!"

**Песьня 7.** *Ірмас.* Шматлікія музычныя прылады клікалі людзей пакланіцца ідалу. Але нашчадкі Давіда, як некалі іхнія айцы, засьпявалі Сыёнскую песьню і супрацівіліся загаду мучыцеля. Яны перамянілі полымя на расу, усклікнуўшы: "Божа айцоў і наш, блаславёны Ты!"

У гэты сьветлы дзень, першы з усіх сьветлых дзён Гасподніх, належыцца людзям Божым радавацца; бо ў ім ёсьць знак вечнасьці і вобраз будучага веку. Усяхвальны Божа айцоў і наш, благаславёны Ты!

Тамаш Блізьнюк паказаў незвычайную сьмеласьць і праз сваё няверства ўзбагаціў нас ласкаю веры. Ён разьвеяў туман няведаньня па ўсім сьвеце, і сабе падрыхтаваў вянец, усклікнуўшы: "Ты Госпад мой." Усяхвальны Божа айцоў і наш, благаславёны Ты!

Не дарма Тамаш быў адсутны і не хацеў паверыць ва ўваскрасеньне Тваё, Хрысьце: ён жадаў даць неабвержны доказ для ўсіх людзей. Вось чаму ён умацаваў веру ўсіх нас няверствам сваім, калі ўсклікнуў: "Ты Госпад мой." Усяхвальны Божа айцоў і наш, благаславёны Ты!

Калі Тамаш уклаў са страхам і трапятаньнем руку сваю ў Твой жыцьцядайны бок, Хрысьце Збавіцелю, ён адчуў дзеяньне дзьвюх нязьлітных прыродаў, зьедналых у Табе, і ўсклікнуў з вераю: "Ты Госпад мой." Усяслаўны Божа айцоў і наш, благаславёны Ты!

*Катавасія.* Той, хто выбавіў юнакоў з агню, стаўшыся чалавекам, церпіць мукі, як сьмяротны, і цярпеньнем сваім сьмяротнае апранае ў красу несьмяротнасьці — адзіны найблаславёны Бог Айцоў і ўсемагутны.

**Песьня 8.** *Ірмас.* Госпада, які зышоў у вогненную печ да юнакоў у выглядзе анёла і захаваў іх някранутымі, слаўце і ўзьвялічвайце праз усе вякі.

Хоць Тамаш жадаў моцна бачыць Цябе, ён спачатку не паверыў; пераканаўшыся, ён назваў Богам і Госпадам Цябе, Уладару, якога мы ўзьвялічваем праз усе вякі.

Госпада, які сьцярпеў неверства Тамаша, паказаў яму свой бок і дазволіў дакрануцца да сябе, слаўце і ўзьвялічвайце праз усе вякі.

Вялікі скарб, што быў схаваны, Тамаш адкрыў нам, калі натхнёна вызнаў Ягонае Боства, усклікнуўшы: "Слаўце і ўзьвялічвайце Хрыста праз усе вякі."

*Катавасія.* Гэты асаблівы і сьвяты дзень, адзіны з усіх суботаў, уладарны і гасподні, сьвята над сьвятамі і ўрачыстасьць над урачыстасьцямі: у гэты дзень благаслаўляем Хрыста на ўсе вякі.

*"Больш годную пашаны..." не сьпяваецца.*

**Песьня 9.** *Ірмас.* Сьветач ясны, Маці Божую, цудоўную славу, вышэйшую за ўсе стварэньні, у песьнях узьвялічым.

Узьвялічваем у песьнях, Хрысьце, Твой дзень, поўны сьвет-лай ласкі, бо ў ім Ты зьявіўся Тваім вучням ва ўсёй красе Тваёй.

Узьвялічваем Цябе, які дазволіў дакрануцца тленнай руцэ да боку Твайго і не спаліў яе агнём боскасьці Тваёй.

Мы ня бачылі на сваё вочы, калі Ты, Хрысьце, уваскрос як Бог з магілы, але ўсім сэрцам верым Табе і ў песьнях узьвялічваем Цябе.

*Катавасія.* Сьвяціся, сьвяціся, Новы Ерусаліме, бо слава Гасподняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне. Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго Ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

**Экзапастыляр** *(тон 1).* Дакрануўшыся да раны ў боку Маім, ня будзь, Тамаш, няверным, бо за цябе Я быў паранены. Будзь адной думкі з іншымі вучнямі і прапаведуй Мяне як Жывога Бога. *(Двойчы)*

Слава... цяпер...

Сёньня вясна пахам сваім напаўняе ўсё, і новае стварэньне радуецца; сёньня замкі варотаў няверства адчыняюцца, і Тамаш кліча: "Ты Госпад і Бог мой!"

**Пахвальныя псалмы**

(*Тон 1*). Пасьля таго, як Ты, Хрысьце Жыцьцядаўца, устаў з мёртвых, не парушыўшы магільных пячацяў, Ты прыйшоў да апосталаў Тваіх, хоць дзьверы былі зачыненыя, і ўсьцешыў іх дарам Духа Твайго праведнага ў вялікай міласэрнасьці Тваёй. (*Двойчы*)

Тамаш Блізьнюк ня быў прысутны, калі Ты, Госпадзе, зьявіўся вучням. Ён не паверыў Твайму ўваскрасеньню, і тым, што бачылі, сказаў: "Пакуль не ўкладу пальца майго ў Ягоны бок і ў раны ад цьвікоў, не паверу, што Ён устаў."

"Дакраніся да Мяне; калі жадаеш — Хрыстос сказаў Тамашу, — укладзі руку тваю і пераканайся, што маю косьці і цела, і ня будзь няверным, але вер, як іншыя." А ён тады ўсклікнуў: "Ты — Бог мой і Госпад мой. Слава ўваскрасеньню Твайму!"

Слава...

(*Тон 6*). Праз восем дзён пасьля ўваскрасеньня Твайго, Ты, Ісусе Ўладару, Адзінароднае Слова Айца, зьявіўся вучням Тваім пры зачыненых дзьвярох, даючы ім Твой супакой, і нявернаму вучню сказаў: "Хадзі і дакраніся да рук і ног Маіх і да майго нятленнага боку." І ён паверыў і ўсклікнуў: "Ты — Госпад і Бог мой. Слава Табе!"

Цяпер...

Найбласлаўлёная Ты...

*Пасьля Вялікага Ўслаўленьня:*

**Трапар** *(тон 7).* Хоцьмагіла **была запячатаная...** *(Гл. ніжэй)*

**Трапар** (*тон 7*). Хоць магіла была запячатаная, Ты, Хрысьце Божа, зазьзяў з магілы; і хоць дзьверы былі зачыненыя, Ты, Уваскрасеньне ўсіх, прыйшоў і стаў сярод вучняў Тваіх, абнаўляючы ў нас праз іх дух правы ў вялікай міласэрнасьці Тваёй.

Слава... цяпер...

**Кандак** (*тон 8*). Дапытліваю рукою Тамаш дакрануўся да жыцьцядайнага боку Твайго, Хрысьце Божа, калі Ты ўвайшоў праз зачыненыя дзьверы, і разам з іншымі апосталамі ўсклікнуў Табе: "Ты Госпад і Бог мой!"

**Пракімен** (*Пс. 146:5,1*). Вялікі Госпад і ўсемагутны, і няма меры розуму яго.

*Верш.* Слаўце Госпада, бо добра пець хвалу яму, бо соладка славіць Бога нашага.

**Чытаньне Апостальскіх Дзеяньняў**

У тыя дні рукамі апосталаў рабілася шмат знакаў і цудаў у народзе. Усе яны прабывалі аднадушныя ў прысенку Салямона. Ніхто з чужых не асьмельваўся далучыцца да іх, а народ іх вельмі хваліў. І ўсё больш прыбывала тых — мужчын і жанчынаў, — што ўверылі ў Госпада. Нават выносілі хворых на вуліцы і клалі на насілках і пасьцелях, каб хоць цень Пятра, калі той праходзіў міма, упаў на каго з іх. І зыходзілася ў Ерусалім мноства людзей з навакольных местаў, несучы хворых і тых, каго мучылі нячыстыя духі; і ўсе яны аздараўляліся. Тады першасьвятар і ўсе, што былі з ім з сэкты садукеяў, поўныя зайздрасьці, схапілі апосталаў і ўкінулі іх у грамадзкую вязьніцу. Але анёл Гасподні ўночы адчыніў дзьверы вязьніцы і, вывеўшы іх, сказаў: "Ідзеце і, стаўшы ў сьвятыні, кажыце народу ўсе словы жыцьця гэтага." (*5:12-20*)

**Алілуя** (*Пс. 94:1,3*). Прыйдзіце, будзем радасна пяяць Госпаду, будзем славіць Бога Збавіцеля нашага.

*Верш.* Бо Госпад — Бог вялікі, і ўладар магутны над усёй зямлёй.

**Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Яна**

Вечарам таго самага першага дня тыдня, калі дзьверы дому, дзе сабраліся вучні, былі зачыненыя дзеля страху перад гэбрэямі, прыйшоў Ісус, стаў пасярэдзіне і сказаў ім: "Мір вам!" Сказаўшы гэта, паказаў ім рукі свае і бок. І ўсьцешыліся вучні, убачыўшы Госпада. А Ісус сказаў ім зноў: "Мір вам! Як паслаў Мяне Айцец, так Я пасылаю вас." Сказаўшы гэта, дыхнуў на іх, кажучы: "Прыміце Духа Сьвятога. Каму адпусьціце грахі, таму будуць адпушчаныя, а каму затрымаеце, на тым застануцца." Тамаш, адзін з Дванаццацёх, званы Блізьнюк, ня быў з імі, калі прыйшоў Ісус. Іншыя вучні сказалі яму: "Мы бачылі Госпада." Але ён адказаў ім: "Калі не пабачу на руках Ягоных ранаў ад цьвікоў, і не ўкладу пальца майго ў раны ад цьвікоў, і не ўкладу рукі маёй ў Ягоны бок, не паверу." І праз восем дзён зноў былі вучні ў доме, і Тамаш з імі. Прыйшоў Ісус праз зачыненыя дзьверы, стаў пасярод іх і сказаў: "Мір вам!" Потым кажа Тамашу: "Дай

палец твой сюды і паглядзі рукі Мае; дай руку тваю і ўкладзі ў бок Мой, і ня будзь недаверкам але вернікам." І сказаў Яму Тамаш у адказ: "Госпад мой і Бог мой!" Ісус сказаў яму: "Ты паверыў таму, што ўбачыў Мяне. Шчасьлівыя тыя, што ня бачылі і ўверылі." Шмат іншых знакаў учыніў Ісус перад сваімі вучнямі, пра якія не напісана ў гэтай кнізе. Гэта ж напісана, каб вы паверылі, што Ісус ёсьць Хрыстос, Сын Божы, і каб, уверыўшы, мелі жыцьцё вечнае. *(20:19-31)*

**Задастойнік:** Анёл усклікнуў Поўнай ласкі: Чыстая Дзева, радуйся! І зноў кажу "Радуйся", бо Твой Сын уваскрос на трэці дзень з магілы, і мёртвых узьняў з сабою. Людзі, весяліцеся.

Сьвяціся, сьвяціся, новы Ерусаліме, бо слава Гасподняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне! Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго Ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

**Прычасьнік:** Хвалі, Ерусаліме, Госпада; слаў Бога твайго, Сыёне. Алілуя, алілуя, алілуя.

**Замест "Мы бачылі...":** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў, і тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў.

**Заканчэньне Літургіі:**

Сьвятар: Слава Табе, Хрысьце Божа, надзея наша, слава Табе.

Людзі: Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў, і тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў. (*Тройчы*)

Сьвятар: *робіць водпуст.*

# ЎЗЬНЯСЕНЬНЕ ГОСПАДА БОГА І ЗБАЎЦЫ НАШАГА ІСУСА ХРЫСТА

## ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."** *пяць наступных песьняў, паўтараючы кожную:*

(*Тон 6*). Госпад узьнёсься на неба, каб пасланць сьвету Пацяшыцеля. Неба падрыхтавала Яму пасад, хмары — Ягоныя ўсходы. Анёлы здумеліся, убачыўшы Чалавека вышэй за іх. Айцец прымае Таго, хто быў ва ўлоньні Яго спрадвеку; Дух Сьвяты загадвае ўсім анёлам: "Адчыніце, князі, брамы вашыя!" Усе народы, пляскайце ў далоні, бо Хрыстос узышоў туды, дзе быў перш.

Хэрувімы зьдзівіліся ўзьнясеньню Твайму, Госпадзе, калі ўбачылі, як Ты, седзячы на хмарах, уздымаешся; мы ж славім Цябе дзеля вялікай міласэрнасьці Тваёй. Слава Табе!

Убачыўшы Тваё ўзьнясеньне на сьвятой гары, Хрысьце, Зьзяньне славы Айца, славім у песьнях сьвятло аблічча Твайго, пакланяемся Тваім мукам, узьвялічваем уваскрасеньне і аддаем хвалу слаўнаму ўзьнясеньню Твайму. Слава Табе!

Калі апосталы ўгледзелі, як Ты, Госпадзе, Жыцьцядаўча Хрысьце, узносіўся на хмарах, яны заліліся сьлязьмі і, поўныя суму, з плачам казалі: "Не пакідай, Уладару, сіротамі слуг Тваіх, якіх Ты палюбіў у міласэрнасьці і добрасардэчнасьці Тваёй, але пашлі нам, як абяцаў, Усесьвятога Духа Твайго, каб Ён прасьвятліў душы нашыя."

Споўніўшы тайну Твайго провіду, Ты, Госпадзе, які дзеля мяне стаўся ўбогім, узяў вучняў Тваіх на Аліўную гару і там, узьнёсшыся, прайшоў праз неба і ўвайшоў туды, адкуль ніколі не адлучаўся. Пашлі нам Усесьвятога Твайго Духа, каб Ён прасьвятліў душы нашыя.

Слава... цяпер...

(*Тон 6*). Не адлучыўшыся ад улоньня Айца, Ты, наймілейшы Ісусе, жыў на зямлі як чалавек, а сёньня на Аліўнай гары ўзьнёсься ў славе , і заняпалую нашую прыроду з сабой міласэрна ўзьняў і пасадзіў поруч з Айцом. Нябесныя хоры анёлаў, убачыўшы цуд, здумеліся і з трапятаньнем узьвялічылі Тваё чалавекалюбства. З імі і мы, зямныя, славім Тваё дзеля нас паніжэньне і ад нас узьнясеньне, і молімся, кажучы: "Ты, што ва ўзьнясеньні сваім напоўніў радасьцю вучняў Тваіх і Багародзіцу, якая нарадзіла Цябе, малітвамі іх зрабі і нас годнымі радасьці абраных Тваіх у веліччы міласэрнасьці Тваёй."

**Чытаньне кнігі прарока Ісаі**

Так кажа Госпад: "У апошнія дні дом Гасподні будзе пастаўлены на вяршыні гары, і ўзьнімецца вышэй за ўсе ўзгоркі, і прыйдуць да яго ўсе народы. Усе народы пойдуць сьпешна да яго, безьліч людзей пойдзе туды,

кажучы: Хадзеце, узыдзем на гару Гасподнюю, у дом Бога Якубавага, хай Ён нам пакажа свой шлях, і мы пойдзем па Ім." (2:1-3).

### Чытаньне кнігі прарока Ісаі

Так кажа Госпад: "Праходзьце, праходзьце у браму! Рыхтуйце шлях мой, рыхтуйце дарогу людзям Маім, зьбярыце каменьне з дарогі, уздыміце сьцяг для народаў." Вось што Госпад абвяшчае ўсім канцом зямлі: "Скажыце дачцы Сыёну, вось прыходзіць Збавіцель твой, а з Ім ідзе Ягоная ўзнагарода, і заплата Ягоная перад Ім. Называць іх будуць «сьвятым народам», збаўленым Госпадам. Цябе ж назавуць жаданым горадам, непакінутым." Хто гэта, што прыходзіць з Эдому, ідзе з Босры ў пурпуровай вопратцы, прыгожы наўзьдзіў у сваім адзеньні? Ён ідзе ў паўнаце сілы сваёй і кажа: "Я той, які кажа праўду, моцны выбаўляць." "Чаму крывавая вопратка Твая, і адзеньне Тваё, як у таго, хто цісьне вінаград у прэсе?" "Я сам цісную яго ў вінапрэсе, і з людзей нікога не было са мною."

Прыгадаю літасьці Госпада, усе дабрадзействы Ягоныя, якія Ён нам учыніў, і вялікую спагадлівасьць Ягоную да дому Ізраіля, якую Ён паказаў у міласэрнасьці сваёй і ў велічы дабротаў сваіх. Ён сказаў: "Сапраўды яны — народ Мой, дзеці Мае, якія ня схлусяць Мне!" І быў Ён ім збаўцам у кожнай бядзе. Не вястун і не анёл, але сам Госпад выратаваў іх. У сваёй літасьці і ласкавасьці Ён сам выкупіў іх, і узьняў, і насіў праз усе дні мінулыя. (*62:10-12; 63:1-2,7-9*)

### Чытаньне кнігі прарока Захара

Так кажа Госпад: "Вось надыходзіць дзень Гасподні, і стануць ногі Ягоныя ў той дзень на гары Аліўнай, насупраць Ерузаліму, з усходу. У той дзень вада жывая пацячэ з Ерусаліму, палова яе ў мора ўсходняе, а другая палова ў заходняе. Летам і зімою так будзе. І будзе Госпад Уладаром над усёй зямлёй, у той дзень будзе Госпад адзіным, і адзіным будзе імя Яго. І краіна вакол зьменіцца і станецца шырокай раўнінаю, ад Гавы аж да Рамону, на поўдзень ад Ерусаліму. І ён (Ерусалім), будзе ўзвышаны і ўстаіць на сваім месцы ад варот Бэніямінавых аж да месца Даўніх варот, да варот Кутніх, і ад вежы Хананеля да скляпоў каралеўскіх. І будуць жыць у ім, і праклёну на ім больш ня будзе, і Ерусалім будзе жыць бясьпечна." (*14:4,8-11*)

### Ліцьця

(*Тон 1*). Ты ўзьнёсься на неба, Госпадзе, адкуль Ты і зышоў. Не пакінь нас сіротамі, хай прыйдзе Дух Твой і прынясе сьвету супакой. Пакажы сыном людзкім сілу Тваю, Госпадзе Чалавекалюбча.

Ты, Хрысьце, узьнёсься да спрадвечнага Айца Твайго, з невыказным боствам Якога ніколі не разлучаўся. Сілы нябесныя, нічога не дадаючы да тройчы сьвятой хвалы Тваёй, вызналі Цябе і пасьля ўцелаўленьня як Адзінага Сына Айца. У багацьці ласкі Тваёй зьмілуйся над намі.

Анёлы Твае, Госпадзе, казалі апосталам : "Мужы галілейскія, чаго стаіце, гледзячы на неба? Той, хто узьнёсься ад вас — Хрыстос Бог. Ён у

такі самы спосаб, як вы бачылі, мае прыйсьці зноў. Дык паслужыце Яму ў набожнасьці і праведнасьці."

(*Тон 4*). Калі Ты, Хрысьце, прыйшоў на Аліўную гару, каб выканаць провід Айца, анёлы здумеліся, і тыя, што ў апраметнай, жахнуліся. Вучні Твае стаялі зьбянтэжаныя і радасныя, калі Ты загаварыў з імі; перад іхнімі вачыма пасад рыхтаваўся на хмарах у чаканьні Цябе; і неба, адчыніўшы брамы, паказала ўсю красу сваю; зямля адкрыла свае таемныя сховішчы, каб паказаць Адамаў упадак і ўзвышэньне. І вось ногі Твае пачалі ўзьнімацца, і было чуваць, як вусны Твае бласлаўлялі голасна. Ты ўзьняўся на хмары, і неба прыняла Цябе. Так, Госпадзе, Ты споўніў гэтую вялікую справу для збаўленьня душ нашых.

Прыроду Адама, якая ўпала ў зямную бездань, Ты, Божа, аднавіў у сабе і сёньня ўзьнёс вышэй за ўсе сілы і пачаткі. Палюбіўшы яе, Ты ў міласэрнасьці сваёй зьяднаў яе з сабою; і, зьяднаўшы, пацярпеў разам з ёю; пацярпеўшы ж — хоць Ты і непадуладны цярпеньням, — Ты ўславіў яе. Бесьцялесныя сілы казалі між сабою: "Хто гэты дзівосны чалавек? Дый Ён ня толькі чалавек, Ён Бог і чалавек, які зьяднаў у сабе дзьве прыроды." Анёлы ў сьветлых вопратках лёталі вакол вучняў і ўсклікалі: "Мужы галілейскія, Той, хто адышоў ад вас, Чалавек-Бог Ісус, як Бог-Чалавек прыйдзе зноў судзіць жывых і мёртвых, і даць верным адпушчэньне грахоў і веліч зьмілаваньня."

Калі Ты, Хрысьце Божа, узьнёсься ў славе, вучні бачылі, як хмары цялесна падымалі Цябе. Брамы нябесныя адчыніліся, хор анельскі радаваўся, і ўсе сілы нябесныя ўсклікалі: "Адчыніце, князі, брамы вашыя, каб увайшоў Уладар славы." Вучні здумеліся і казалі: "Не адлучайся ад нас, добры Пастыру, але пашлі нам Духа Твайго ўсесьвятога, каб ён навучыў і ўмацаваў нас, і прасьвятліў і асьвяціў душы нашыя."

Слава ... цяпер...

(*Тон 4*). Споўніўшы тайну любові, схаваную спрадвеку ад людзей, Ты, Госпадзе, прыйшоў на Аліўную гару разам з Тваімі вучнямі і з Тою, што нарадзіла Цябе, Творцу і Ўладара ўсіх. Бо выпадала, каб Тая, якая больш за ўсіх па-матчынаму цярпела, бачыўшы мукі Твае, усьцешылася, убачыўшы вялікую славу цела Твайго. З Ёю і мы, што сталіся саўдзельнікамі радасьці, гледзячы на Твой, Уладару, узыход на неба, славім Тваю вялікую спагадлівасьць да нас.

**Вершапесьні**

(*Тон 2*). Ты, Божа наш, нарадзіўся, як захацеў, зьявіўся нам з уласнай волі Тваёй; пацярпеў цялесна і з мёртвых уваскрос, перамогшы сьмерць. Споўніўшы ўсё, Ты ўзьнёсься ў славе і паслаў нам Духа Боскага, каб нам хваліць і ў песьнях славіць Боства Тваё.

*Верш.* Усе народы, пляскайце ў далоні, усклікніце Богу радасным голасам.

Убачыўшы, як Ты, Хрысьце, узьносіўся на Аліўнай гары, сілы нябесныя пыталіся адно ў аднаго: "Хто гэта ?" І пачулі адказ : "Гэта Ўладар славы,

велічны і магутны, непераможны ў барацьбе." "І чаму ў Яго пурпуровая вопратка?" — "Бо Ён прыходзіць з Басоры, што з начыць з цела чалавечага." А сам Ты, як Бог, сеўшы па правай руцэ Велічы, паслаў нам Духа Сьвятога, каб навучаў нас і збаўляў душы нашыя.

*Верш.* Бог узьнёсься пад радасныя воклікі, Госпад — пад гучаньне трубаў.

Ты, Хрысьце Божа, узьнёсься на Аліўнай гары ў славе ў прысутнасьці вучняў Тваіх, і сеў па правай руцэ Айца, напоўніўшы ўсё Боствам, і паслаў нам Духа Сьвятога, які прасьвятляе, умацоўвае і асьвячае душы нашыя.

Слава... цяпер...

(*Тон 6*). Бог узьнёсься пад радасныя воклікі, Госпад — пад гучаньне трубаў, каб падняць заняпалы Адамаў вобраз і паслаць Пацяшыцеля Духа для асьвячэньня душаў нашых.

**Адпушчальны трапар.**

(*Тон 4*). Узьнёсься Ты ў славе, Хрысьце Божа наш, узрадаваўшы вучняў Тваіх абяцаньнем Сьвятога Духа, і ўмацаваўшы іх Тваім блаславеньнем, бо Ты — Сын Божы, Збавіцель сьвету. (*Тройчы*)

## ЮТРАНЬ

**Трапар** (*Тон 4*). Узьнёсься Ты ў славе... (*Тройчы*)

**Першая сядальная песьня** (*тон 1*). Анёлы дзівіліся цуду ўзьнясеньня Твайго, вучні дрыжэлі, гледзячы на Тваё страшнае ўзвышэньне. Ты ўзышоў у славе як Бог, і брамы нябесныя адчыніліся перад Табою, а ўсе анельскія хоры ў зьдзіўленьні ўсклікнулі: "Слава паніжэньню Твайму, слава валадарству Твайму, слава ўзьнясеньню Твайму, адзіны Чалавекалюбча!" (*Двойчы*)

**Другая сядальная песьня** (*тон 3*). Спрадвечны і беспачатны Бог, які ўспрыняў людзкую прыроду і абагавіў яе, сёньня ўзьняў яе з сабою. Анёлы ішлі перад Ім і паказвалі апосталам, як Ён узносіцца ў вялікай славе. І тыя пакланіліся Яму, усклікаючы: "Слава Богу, што ўзьнёсься на неба!" (*Двойчы*)

**Узьвялічваньне пасьля паліелею:** Узьвялічваем Цябе, Жыцьцядаўча Хрысьце, і славім Тваё з усячыстым целам Тваім Боскае ўзьнясеньне на неба.

*Верш 1.* Усе народы, пляскайце ў далоні, усклікніце Богу радасным голасам.

*Верш 2.* Сказаў Госпад Госпаду майму: Сядзь па правай руцэ маёй, пакуль не пакладу ворагаў тваіх пад ногі Табе.

*Верш 3.* Узьнясіся на нябёсы, Божа, і хай па ўсёй зямлі разыдзецца слава Твая.

*Верш 4.* Узьнясіся, Госпадзе, сілаю сваёю! Будзем пяяць і славіць магутнасьць Тваю.

Слава... цяпер...
Алілуя, алілуя, алілуя. Слава Табе, Божа! (*Тройчы*)

**Сядальная песьня** *(тон 5).* Ты зышоў з неба на зямлю і як Бог вызваліў Адамаў род, што ляжаў у пякельнай няволі, ўзьняў яго з сабою на нябёсы і пасадзіў на пасадзе Айца Твайго ў міласэрнасьці і Чалавекалюбстве Тваім.

**Узыходныя песьні:** *першы антыфан 4 тону.*

**Пракімен.** Бог узьнёсься пад радасныя воклікі, Госпад — пад гучаньне трубаў.
*Верш.* Усе народы, пляскайце ў далоні, усклікніце Госпаду радасным голасам.

**Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Марка**

У той час Ісус уваскрос рана ў першы дзень тыдня. Ён паказаўся сьпярша Марыі Магдалене, з якой выгнаў сем бесаў. Яна, пайшоўшы, абвясьціла тым, што былі з Ім, а цяпер сумавалі і плакалі. Але тыя, пачуўшы, што Ён жыве і што яна бачыла Яго, не паверылі. Пасьля гэтага Ён паказаўся двум з іх у іншым выглядзе, калі яны ішлі ў вёску. А тыя, пайшоўшы, абвясьцілі астатнім, але і ім не паверылі. Пазьней Ён паказаўся і самім Адзінаццацём, калі яны засядалі за сталом, і дакараў іх за іхняе няверства і нячуласьць сэрца, што яны не паверылі тым, хто бачыў Яго ўваскрослым. І казаў ім: "Ідзеце па ўсім сьвеце і абвяшчайце Евангельле ўсякаму стварэньню. Хто ўверыць і ахрысьціцца, будзе збаўлены, а хто ня ўверыць, будзе асуджаны. А вось знакі, якія будуць суправаджаць тых, якія ўверылі: Маім імем будуць выганяць злых духаў, будуць гаварыць новымі мовамі, будуць браць у рукі гадзюкаў, і калі б выпілі нешта атрутнае, не пашкодзіць ім. На хворых ускладуць рукі, і тыя ацалеюць." І вось, пасьля размовы з імі, Госпад быў узьняты на неба і сеў па правай руцэ Бога. А яны пайшлі і абвяшчалі ўсюды Евангельле, а Госпад дапамагаў ім і пацьвярджаў іхнія словы знакамі, якія іх суправаджалі. Амін. *(16:9-20)*

*Уваскрасеньне Хрыстова... Пс 50.*

Слава...: Малітвамі апосталаў...

Цяпер...: Малітвамі Багародзіцы...

Зьмілуйся нада мною, Божа...: (*Тон 6*). Анельскія хоры, убачыўшы сёньня на нябёсах нашую прыроду, зьдзівіліся невыканаму ўзьнясеньню і казалі адзін аднаму: "Хто гэта Той, што прыходзіць?" Пазнаўшы свайго Ўладара, яны загадалі адчыніць нябесныя брамы. Разам з імі і мы славім няспынна Цябе, што маеш прыйсьці зноў у целе, як Судзьдзя ўсіх і Бог усемагутны.

**КАНОНЫ**

**Песьня 1**

*Канон 1 (тон 5). Ірмас.* **Адзінаму** Збавіцелю **Богу які правёў народ свой** праз мора з сухімі **нагамі і патапіў** фараона з **ягоным войскам, пяём, бо Ён** услявіўся.

Запяём, людзі, пераможную песьню Хрысту, што ўзьнёсься на хэрувімах і пасадзіў нас па правай руцэ Айца, бо Ён уславіўся.

Убачыўшы Хадайніка між Богам і людзьмі, Хрыста, з целам на вышынях, анёлы зьдзівіліся і дружна засьпявалі пераможную песьню, бо Ён уславіўся.

Богу, які аб'явіўся на Сынайскай гары і даў закон багавідцу Майсею, і на гары Аліўнай узьнёсься цялесна, пяём, бо Ён уславіўся.

*Багародзічны.* Усячыстая Маці Божая, малі няспынна Бога, што прыняў цела ад Цябе, не адлучыўшыся ад улоньня Айца, каб Ён збавіў ад усякіх нягодаў стварэньні свае.

*Канон 2. (Тон 4). Ірмас.* Адчыню вусны мае, і напоўняцца Духам; і слова скажу ў гонар Уладаркі Маці, сьвяткуючы сьветлую ўрачстасьць і славячы радасна ў песьнях цуды Яе.

Ты, Хрысьце і Творча ўсіх, несьмяротны прыродаю, ўваскрос на трэці дзень, зьявіўся адзінаццацём апосталам і ўсім вучням Тваім, і ўзьнёсься на хмары да Айца.

Боганатхнёны Давід усклікае ў песьні: "Узышоў Госпад на неба пад радасныя воклікі і гучаньне трубаў, узьняўся да Айца, Уладара сьвятла."

Слава...: Ты, Госпадзе, сваімі мукамі і ўваскрасеньнем абнавіў сьвет, што састарэў у грахох; і ўзышоў на хмары да нябёсаў. Слава сіле Тваёй.

Цяпер...: Ты, усебеззаганная Ўладарка, нарадзіла Ўладара ўсіх, які дабравольна пацярпеў і, узяўшы з сабою цела, узышоў да свайго Айца, якога не пакідаў.

*Катавасія.* Агорнуты боскай хмараю, заіклівы Майсей абвясьціў Богам напісаны закон; страсянуўшы твань з вачэй сэрца свайго, ён убачыў Таго, хто ёсьць, і, навучаны Духам розуму, усхваліў Яго ў натхнёных песьнях.

**Песьня 3**

*Канон 1 (Тон 5). Ірмас.* Сілаю Крыжа Твайго, Хрысьце, умацуй мой розум, каб мне ў песьнях славіць Тваё збавеннае ўзьнясеньне.

Ты ўзьнёсься, Жыцьцядаўча Хрысьце, да Айца, і ўзьняў з сабою род наш людзкі, у невыказнай добрасардэчнасьці Тваёй.

Хоры анельскія, Збавіцелю, убачыўшы людзкую прыроду, што з Табою ўзыходзіць на неба, сумеліся і ўсхвалілі Цябе.

Анельскія хоры сумеліся, Хрысьце, убачыўшы, як Ты цялесна ўзьнёсься, і ўсхвалілі Тваё сьвятое ўзьнясеньне.

Ты, Хрысьце, узнавіў сатлелую людзкую прыроду і ўзьнясеньнем сваім узьнёс яе, і нас з сабою праславіў.

*Багародзічны.* Малі няспынна, Усячыстая, Таго, хто выйшаў з улоньня Твайго, за вызваленьне ад спакусы тых, што славяць Цябе як Божую Маці.

*Канон 2 (тон 4). Ірмас.* У боскай славе Тваёй, Багародзіца, жывая і невычэрпная Крыніца, умацуй аднадушны хор песьняроў Тваіх і зрабі іх дастойнымі вянцоў славы.

"Адчыніце нябесныя брамы, бо вось ідзе Хрыстос, Уладар усяго стварэньня, апрануты ў зямное цела!" — ніжэйшыя сілы казалі вышэйшым.

Знайшоўшы Адама, які быў спакушаны зьмяёю, і апрануўшыся ў яго, Ты, Хрысьце, узышоў на неба і сеў па правай руцэ Айца, як роўнапасадны, пад гучаньне песьняў анельскіх, што славілі Цябе.

Слава...: Зямля сьвяткуе і цешыцца, і радуецца неба, з-за ўзьнясеньня Творцы ўсяго стварэньня, які воляю зьяднаў разьяднанае.

Цяпер...: Ты, Маці Дзева ўсячыстая, нарадзіла Пераможцу сьмерці, адзінага несьмяротнага Бога. Малі Яго няспынна, каб Ён умярцьвіў мае забойчыя пажаданьні і збавіў мяне.

*Катавасія.* Некалі пакорлівая малітва прарочыцы Ганны ў скрусе сэрца да Ўсемагутнага Бога разьвязала путы няплоднага ўлоньня і пасароміла гордасьць і пыху пладавітае.

**Сядальная песьня** *(тон 8).* Сеўшы на хмары, Ты пакінуў сьвет дзеля тых, што на зямлі, ўзышоў на неба і сеў па правай руцэ Айца, як адзінасутны з Ім і з Духам. Хоць Ты і зьявіўся ў целе, але застаўся нязьменным. Дзеля гэтага чакаем спаўненьня ўсяго, калі прыйдзеш зноў на зямлю судзіць сьвет. Справядлівы Судзьдзя, Госпадзе, пашкадуй душы нашыя і, як міласэрны Бог, дай адпушчэньне правінаў слугам Тваім.

**Песьня 4**

*Канон 1 (Тон 5). Ірмас.* Я пачуў, Госпадзе, вестку аб сіле Крыжа, якім рай быў адчынены, і ўсклікнуў: "Слава сіле Тваёй, Госпадзе!"

Ты, Уладару анёлаў, узьнёсься ў славе і паслаў нам ад Айца Пацяшыцеля. Таму клічам: "Слава, Хрысьце, узьнясеньню Твай-му!"

Анельскія хоры дзіву даліся, калі Збавіцель узышоў з целам да Айца, і ўсклікнулі: "Слава, Хрысьце, узьнясеньню Твайму!"

*Анельскія хоры ўсклінулі вышэйшым сілам: "Адчыніце брамы Хрысту,* Уладару нашаму, якога славім разам з Айцом і Духам!"

*Багародзічны.* Дзева нарадзіла бяз болю і засталася Дзеваю. Яна сталася Маці, якую мы славім, усклікаючы: "Радуйся, Багародзіца!"

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Хрыстос, Бог спрадвечны, што сядзіць у славе на боскім пасадзе, прыходзіць на хуткай хмары і нятленнай рукою збаўляе тых, што клічуць: "Слава, Хрысьце, сіле Тваёй."

Ісус Жыцьцядаўца, прыняўшы тых, каго палюбіў, узыходзіць на Аліўную гару і, блаславіўшы іх, на хмары ўзносіцца да Айца, чыйго ўлоньня не пакідаў.

Увесь бачны і нябачны сьвет сьвяткуе, анёлы радасна пяюць і людзі няспынна славяць узьнясеньне Таго, хто ў дабрыні сваёй захацеў цялесна зьяднацца з намі.

Слава...: Ісусе ўсемагутны, Госпадзе чалавекалюбны, Ты разбурыў уладу сьмерці, дараваў усім несьмяротнасьць і узьнёсься ў славе ў прысутнасьці пачэсных вучняў Тваіх.

Цяпер...: Блаславёнае ўлоньне Тваё, Усебеззаганная: Ты ўдастоілася зьмясьціць Таго, хто спустошыў пекла: Малі Яго, каб Ён збавіў тых, што славяць Цябе.

*Катавасія.* Ты, Уладару ўладароў, Адзіны ад Адзінага, Слова, што выходзіць ад Айца беспачатнага, паслаў роўнамоцнага свайго Духа апосталам Тваім, якія Табе як Дабрачынцу пяюць : "Слава сіле Тваёй, Госпадзе!"

**Песьня 5**

*Канон 1 (Тон 5). Ірмас.* Зранку клічам Цябе, Госпадзе: "Збаў нас, бо Ты Бог наш, апроч Цябе іншага бога ня знаем!"

Напоўніўшы ўсё радасьцю, Ты ўзышоў з целам жыць да вышэйшых сілаў.

Анёлы, убачыўшы, як Ты быў узьнесены, усклікнулі: "Адчыніце брамы Ўладару нашаму!"

Апосталы ўбачылі ўзьнясеньне Збавіцеля і з трымценьнем усклікнулі: "Уладару наш, Слава Табе!"

*Багародзічны.* Славім, Цябе, Багародзіца, што засталася пасьля родаў Дзеваю, бо Ты нарадзіла на сьвет у целе Бога-Слова.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Усё стварэньне сумелася, убачыўшы боскую славу Тваю: Ты, Дзева, што мужа ня знала, мела ва ўлоньні Бога ўсіх, і нарадзіла спрадвечнага Сына, які дае супакой усім, што славяць Цябе.

Зьнішчыўшы сьмерцю сьмерць, Ты, Госпадзе, узяў з сабою тых, каго Ты любіў, і узышоў на сьвятую Аліўную гару, адкуль Ты, Хрысьце, на хмары ўзьняўся да Айца .

Дзіўнае Тваё нараджэньне, Жыцьцядаўча, дзіўнае ўваскрасеньне з мёртвых, дзівоснае Тваё ўзьнясеньне на Аліўнай гары, вобразам якога была калясьніца Ільлі, што узьнялася да неба. Славім Цябе ў песьнях, Чалавекалюбча.

Слава...: Анёлы сказалі апосталам, якія працягвалі глядзець: "Мужы галілейскія, што вы глядзіце, чаму дзівіцеся ўзьнясеньню Хрыста

Жыцьцядаўца? Ён прыйдзе зноў на зямлю судзіць сьвет, як справядлівы Судзьдзя."

Цяпер...: Хрыстос, які захаваў Цябе, Божая Маці, Дзеваю пасьля родаў, узьнёсься да Айца свайго, якога не пакідаў, хоць і прыняў ад Цябе адухоўленае цела ў вялікай міласэрнасьці сваёй.

*Катавасія.* Як дасканалае ачышчэньне ад грахоў, прыміце, сьветлыя дзеці Царквы, палымяную расу Духа. Сёньня з Сыёну выйшлі новы закон і ласка Духа ў выглядзе вогненных языкоў.

**Песьня 6**

*Канон 1 (Тон 5). Ірмас.* Бездань агарнула мяне, зьвер марскі стаўся мне магілаю, але я паклікаў Цябе, чалавекалюбны Госпадзе, і правіца Твая збавіла мяне.

Апосталы ўсьцешыліся, убачыўшы, як сёньня Творца ўзьнімаецца на хмарах. У непахіснай надзеі атрымаць Духа, яны са страхам усклікнулі: "Слава ўзьнясеньню Твайму!"

Анёлы сталі перад вучнямі Тваімі, Хрысьце, і ўсклікнулі: "Вы бачылі, як Хрыстос узышоў цялесна на неба. Гэтаксама Ён прыйдзе зноў як праведны Судзьдзя ўсіх."

Калі нябесныя сілы ўбачылі, як Ты, Збавіцелю наш, узыходзіш цялесна на неба, яны ўсклікнулі: "Вялікае чалавекалюбства Тваё, Уладару!"

*Багародзічны.* Кустом незгаральным, Гарою і Лесьвіцай адухоўленаю, і Брамаю нябеснаю дастойна завем Цябе, Марыя слаўная, верных Пахвала.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* На гэтую боскую і пачэсную ўрачыстасьць Божай Маці, прыйдзіце, усе багамудрыя, пляскайце ў далоні і слаўце Таго, хто нарадзіўся ад Яе.

Хай хмары льюць нам згары вечную радасьць, бо вось Хрыстос на хмары, быццам на хэрувімах, да Айца свайго сёньня ўзыходзіць.

Зьявіўшыся ў целе, Ты, Добры Чалавекалюбча, сабраў у адно разьяднаных, і ўзнёсься на неба ў прысутнасьці вучняў Тваіх.

Слава...: "Чаму чырвоная вопратка ў Таго, хто ўзяў на сябе цяжар цела?" — сьвятыя анёлы казалі між сабою, убачыўшы Хрыста, які насіў на сабе знакі сваіх пачэсных і боскіх пакутаў.

Цяпер...: Славім у песьнях, Дзева, Тваё зачацьце, славім Тваё невыказнае сынараджэньне, якім мы, Чыстая, выбавіліся ад тленнасьці і злосьці, і ад змрочнае пякельнае няволі.

*Катавасія.* Ты, Хрысьце Ўладару, нашае ачышчэньне і збаўленьне, зазьзяў ад Дзевы і, быццам прарока Ёну з нутра марскога зьвера, вызваліў ад тленнасьці ўвесь заняпалы Адамаў род.

**Кандак** *(тон 6)*. Споўніўшы справу нашага збаўленьня і зьяднаўшы зямное з нябесным, Ты ўзьнёсься ў славе, Хрысьце Божа наш, не адлучыўшыся ад нас, але неразлучна прабываючы з намі і кажучы тым, што любяць Цябе: "Я з вамі, і ніхто ня зможа нічога супраць вас."

*Ікас*. Пакінем на зямлі зямныя клопаты, і ўсё, што стаецца попелам і пылам, і ўздымем на вышыні нашыя вочы, думкі і пачуцьці. Глянем на браму нябесную, уявім, што мы на Аліўнай гары і ўзіраемся на Збавіцеля, які ўзносіцца на хмары. Вось Госпад узыходзіць на неба, і ў сваёй шчодрасьці раздае дары апосталам. Як Айцец сыноў, Ён пацяшае, умацоўвае і настаўляе іх, і кажа: "Не пакідаю вас саміх: Я з вамі, і ніхто ня зможа нічога супраць вас."

**Песьня 7**

*Канон 1 (Тон 5). Ірмас.* У печы вогненнай збавіў юнакоў, якія славілі Яго, бласлвёны Бог Айцоў нашых.

На сьветлай хмары узьнёсься і збавіў сьвет блаславёны Бог айцоў нашых.

Узяўшы на плечы заблудную чалавечую прыроду, Ты, Збавіцелю, узьнёсься і прынес яе Богу і Айцу.

Узышоў у целе да бесьцялеснага Айца блаславёны Бог айцоў нашых.

Ты ўзяў амярцьвелую грахом нашу прыроду і занёс яе Твайму адзінасутнаму Айцу.

*Багародзічны.* Сам стварыўшы Багародзіцу Дзеву, ад Яе нарадзіўся блаславёны Бог айцоў нашых.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Мужныя і багамудрыя юнакі не захацелі служыць стварэньню замест Творцы і, вогненнае выпрабаваньне за ніштo палічыўшы, радасна сьпявалі: "Усяхвальны Госпад і Бог айцоў, блаславёны Ты."

Сьветлая Хмара прыняла Цябе, Госпадзе, Сьвятло існае, і ўзьняла ад зямлі ў невыказны спосаб. Нябесныя хоры і апосталы ўславілі Цябе ў песьнях, кажучы: "Божа, блаславёны Ты!"

Пляскайма ў далоні, цешачыся з Узьнясеньня Хрыстовага, і ўсклікайма: "Бог узьнёсься пад гучаньне трубаў і сеў па правай руцэ Айца, як роўнапасадны на ўсе вякі."

Слава...: Калісьці вялікі Майсей у песьні ўсклікнуў: "Хай анёлы ў небе пакланяюцца Хрысту, як Уладару ўсіх!" Мы ж клічам: "Божа айцоў нашых, Госпадзе, блаславёны Ты!"

Цяпер...: Слаўны цуд! Як гэта Ты, Поўная Божае ласкі, зьмясьціла ў сабе Бога незьмяшчальнага, які, каб ажывіць чалавека, зьбеднеў, прыняўшы цела, і сёньня ў вялікай славе ўзьнёсься на неба.

*Катавасія.* Гучаньне музыкі клікала на пакланеньне залатому бяздушнаму ідалу. Праменная ж ласка Пацяшыцеля ўздымае нас, і мы ўсклікаем: "Тройца адзіная, роўнасільная, беспачатная, блаславёная Ты!"

**Песьня 8**

*Канон 1 (Тон 5). Ірмас.* Сына і Бога, які спрадвеку нарадзіўся ад Айца, і ў апошні час прыняў цела ад Дзедвы Маці, сьвятары, слаўце ў песьнях, людзі, узьвялічвайце праз усе вякі.

Жыцьцядаўца Хрыста, які ў дзьвюх прыродах узьняўся ў славе на неба і сеў побач з Айцом, сьвятары, слаўце ў песьнях, людзі, узьвялічвайце праз усе вякі.

Цябе, Збавіцелю, які вызваліў стварэньне з ідальскае няволі, і прадставіў яго свабодным Твайму Айцу, славім і ўзьвялічваем праз усе вякі.

*Багародзічны.* Ты, Багародзіца чыстая, явілася вышэйшай за неба, бо ва ўлоньні Тваім насіла Таго, хто сядзіць на хэрувімах і якога разам з анельскімім сіламі мы, людзі, славім праз усе вякі.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Народжаны ад Багародзіцы набожных юнакоў у печы выбавіў; тады вобразна, а цяпер дзейсна натхняе Ён увесь сьвет пяяць: "Слаўце, усе стварэньні, Госпада і ўзьвялічвайце Яго на ўсе вякі."

Анёлы зьявіліся апосталам у дзень Узьнясеньня і сказалі ім: "Што вы стаіце, гледзячы на неба? Той, хто узьняўся, прыйдзе зноў на зямлю судзіць людзей, як адзіны справядлівы Судзьдзя."

Узьвялічым Бога, злучым галасы у адзін хор хвалы, будзем пяяць, скакаць і пляскаць у далоні: Бог наш узьняўся зноў ад зямлі на неба, а анёлы і арханёлы пелі хвалу Ўладару і Творцы ўсіх.

Блаславляем Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, Госпада.

Прырода наша, што калісь заняпала, была ўзьнятая вышэй за анёлаў і пасаджаная на пасадзе Боскім вышэй за ўсякае разу-меньне. Дык хадзеце, будзем сьвяткаваць і клікаць: "Блаславіце, усе стварэньні, Госпада і ўзьвялічвайце Яго праз усе вякі."

Цяпер...: Сын Твой, Багародзіца, што паланіў крыжом сьмерць, ўваскрос на трэці дзень, зьявіўшыся вучням сваім, і ўзьняўся на неба. Дзеля гэтага разам з анелькім сіламі і мы пакланяемся, славім і ўзьвялічваем Цябе праз усе вякі.

Хвалім, блаславляем і пакланяемся Табе, Госпадзе, пеючы і ўзьвялічваючы Цябе праз усе вякі.

*Катавасія.* Тройчы сьветлы вобраз Боскай велічы разрывае путы і вылівае расу на полымя. Юнакі славяць Яго і ўсё стварэньне блаславляе, як Дабрачынца, адзінага Збавіцеля і Творцу ўсяго.

**Песьня 9**

*Замест "Больш годную пашаны..." сьпяваюцца асобыя прыпевы.*

*Перш прыпеў.* Узьвялічвай, душа мая, Хрыста **Жыцьцядаўца, што** ўзьнёсься ад зямлі на неба.

*Канон 1 (Тон 5). Ірмас.* Цябе, Маці Божую, што, вышэй за ўсякія словы і розум, у невыказны спосаб нарадзіла ў часе Спрадвечнага, мы, верныя, аднадушна ўзьвалічваем.

Апосталы, абнятыя страхам, узьвялічылі Цябе, калі ўбачылі як Ты, Збавіцелю сьвету Хрысьце Божа, у боскі спосаб узьнімаўся на неба.

Калі анёлы, Хрысьце, убачылі на вышыні Тваё абагаўлёнае цела, яны казалі адзін аднаму: "Сапраўды гэта Бог наш."

Нябесныя хоры, убачыўшы, як Ты, Хрысьце Божа, узьнімаўся на хмары, усклікнулі: "Адчыніце брамы Уладару славы!"

Цябе, які зышоў да апошніх канцоў зямлі, збавіў чалавека і ўзвысіў яго ўзьнясеньнем Тваім, узьвялічваем.

*Багародзічны.* Радуйся, Багародзіца, Маці Хрыста Бога, якога Ты нарадзіла і якога, бачыўшы, як Ён узносіўся на неба, разам з апосталамі ўзьвялічыла.

*Другі прыпеў:* Анёлы, убачыўшы ўзыход Уладара, жахнуліся: як гэта Ён у славе ўзносіцца ад зямлі да неба.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Усе народжаныя на зямлі хай усьцешацца, прасьветленыя Духам. Хай сьвяткуюць бесьцялесныя анельскія хоры, ушаноўваючы ўрачыстасьць Божае Маці, і хай пяюць: "Радуйся, усеблаславёная Багародзіца, чыстая заўсёды Дзева!"

Дар, што пераўзыходзіць усякае разуменьне! Страшны цуд! Госпад узьнёсься ад зямлі на неба і паслаў вучням сваім Духа Сьвятога, які прасьвятліў іхні розум і ахінуў полымем ласкі.

Госпад сказаў грамадзе вучняў сваіх: "Заставайцеся ў Ерусаліме, пакуль Я пашлю вам іншага Пацяшыцеля, роўнапасаднага і роўнапачэснага з Айцом і Мною; глядзіце, як Ён лунае ў небе і набліжаецца на сьветлай хмары."

Слава...: Веліч Таго, хто дабравольна зьбяднеў, прыняўшы цела, узьнялася вышэй за нябёсы, і наша заняпалая прырода праславілася, сеўшы побач з Айцом. Дык сьвяткуйма аднагалосна, весела сьпявайма і, поўныя радасьці, пляскайма ў далоні.

Цяпер...: Сьвятло ад спрадвечнага Сьвятла з Цябе, Усебеззаганная, зазьзяла, цемру бязбожжа разагнала і прасьвятліла тых, што спалі ў ночы. Дзеля гэтага мы ўсе Цябе, як і належыцца, вечна ўзьвялічваем.

*Катавасія.* Радуйся, Уладарка, пахвала дзеваў і матак; ніякія красамоўныя вусны ня ў стане належна ўславіць Цябе, і розум бясьсільны зразумець сынараджэньне Тваё. Дзеля гэтага мы ўсе суладна Цябе славім.

**Экзапастыляр** (*тон 2*). У прысутнасьці вучняў Тваіх Ты, Хрысьце, узьнёсься і сеў побач з Айцом; анёлы ляцелі перад Табою і ўсклікалі: "Адчыніце брамы, адчыніце, бо вось Уладар узыходзіць да спрадвечнага Сьвятла славы."

**Пахвальныя псалмы**

(*Тон 1*). Засьпявайма тут на зямлі анельскую песьню Богу, усклікаючы: "Сьвяты Ты, Ойча нябесны, і Слова спрадвечнае, і Духу ўсесьвяты!" (*Двойчы*)

Князі анельскія, гледзячы на Тваё, Збавіцелю, узьнясеньне, сумеліся і пыталіся адзін у аднаго: "Што гэта мы бачым? На выгляд Чалавек у целе, а ўзыходзіць, як Бог, вышэй за нябёсы!"

Галілейцы, якія глядзелі, як Ты, Слова, на Аліўнай гары ўзьнёсься ў целе, пачулі ад анёлаў: "Чаго стаіце і дзівіцеся? Ён прыйдзе зноў у целе, як вы Яго цяпер бачылі."

Слава... цяпер...

(*Тон 2*). Нарадзіўся Ты, Божа наш, як захацеў, зьявіўся нам з уласнае волі Тваёй, пацярпеў цялесна і з мёртвых уваскрос, перамогшы сьмерць. Споўніўшы ўсё, Ты ўзьнёсься ў славе і паслаў Боскага Духа, каб нам хваліць і славіць у песьнях Боства Тваё.

*Пасьля Вялікага ўслаўленьня:*

**Трапар.** (*Тон 4*). Узьнёсься Ты ў славе, Хрысьце Божа наш, узра-даваўшы вучняў Тваіх абяцаньнем Сьвятога Духа, і ўмацаваўшы іх Тваім блаславеньнем, бо Ты — Сын Божы, Збавіцель сьвету.

## ЛІТУРГІЯ

**Першы антыфан** (*Пс 46:2,3,5*)

**Чытальнік**: Усе народы, пляскайце ў далоні, ўсклікніце Госпаду радасным голасам.

**Людзі**: Малітвамі Багародзіцы, Збавіцелю, збаў нас. (*Так пасьля наступных вершаў*).

**Чытальнік**: Бо Госпад Усявышні страшны: Ён вялікі Ўладар над усёй зямлёй.

— Ён скарае нам людзей і кладзе народы пад ногі нашыя.

— Бог узьнёсься пад радасныя воклікі, Госпад — пад гучаньне трубаў.

— Слава... цяпер...

Людзі: Малітвамі Багародзіцы, Збавіцелю, збаў нас.

**Другі антыфан** (*Пс 47:2,3,4,5*)

**Чытальнік**: Вялікі Госпад і годны ўсякай хвалы ў месьце Бога нашага, на гары сьвятой Яго.

Людзі: Сыне Божы, што ўзьнёсься ў славе, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя. (*Так пасьля наступных вершаў*).

**Чытальнік**: Пышнае ўзвышша, радасьць усяе зямлі: на ягоным паўночным канцы — гара Сыён, горад Караля вялікага.

— Бог у харомах ягоных явіўся надзейным абаронцам.

— Вось усе ўладары зямныя сышліся, сабраліся разам.

Людзі: Сыне Божы... Слава... цяпер... Адзінародны Сыне...

**Трэці Антыфан** (*Пс 48:2,3,4,5*)

**Чытальнік**: Пачуйце гэта, усе людзі, слухайце ўважліва, усе жыхары зямлі.

Людзі: (*Тон 4*) Узьнёсься Ты ў славе, Хрысьце Божа наш, узрадаваўшы вучняў Тваіх абяцаньнем Сьвятога Духа, і ўмацаваўшы іх Тваім блаславеньнем, бо Ты — Сын Божы, Збавіцель сьвету. (*Так пасьля наступных вершаў*)

Чытальнік: Простыя людзі і вяльможы, багатыя разам з беднымі.

— Вусны мае кажуць словы мудрасьці, разважнасьць — роздум сэрца майго.

— Нахілю да прыповесьцяў вуха маё, пад гучаньне гусьляў дам разгадку маю.

Людзі: Узьнёсься Ты ...

Сьвятар (*Уваходны верш*): Бог узьнёсься пад радасныя воклікі, Госпад — пад гучаньне трубаў.

Людзі: Сыне Божы, што ўзьнёсься ў славе, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

**Трапар** (*тон 4*). Узьнёсься Ты ў славе, Хрысьце Божа наш, узрадаваўшы вучняў Тваіх абяцаньнем Сьвятога Духа, і ўмацаваўшы іх Тваім блаславеньнем, бо Ты — Сын Божы, Збавіцель сьвету.

Слава... цяпер...

**Кандак** (*тон 6*). Споўніўшы справу нашага збаўленьня і зьяднаўшы зямное з нябесным, Ты ўзьнёсься ў славе, Хрысьце Божа наш, не

адлучыўшыся ад нас, але неразлучна прабываючы з намі і кажучы тым, што любяць Цябе: "Я з вамі, і ніхто ня зможа нічога супраць вас."

**Пракімен** (*Пс 56:5,7*). Узьнясіся на неба, Божа, і хай па ўсёй зямлі разыдзецца слава Твая.

*Верш.* Гатовае сэрца маё, Божа, гатовае сэрца маё: пад гукі гусьляў пяяць буду славу Тваю.

**Чытаньне Апостальскіх Дзеяньняў**

Першую кнігу напісаў я, Тэафілю, пра ўсё, што Ісус рабіў і чаго навучаў ад пачатку аж да дня, у які ўзьнёсься, даўшы праз Духа Сьвятога настаўленьні апосталам, якіх выбраў і якім даў мноства доказаў, што Ён жывы, зьяўляючыся ім на працягу сарака дзён пасьля сваіх мукаў і гаворачы аб Валадарстве Божым. І вось, калі быў з імі, загадаў ім не адыходзіць ад Ерусаліму, але чакаць абяцаньня Айца, "Аб якім вы чулі ад Мяне. Бо Ян хрысьціў вадою, а вы праз некалькі дзён будзеце ахрышчаныя Духам Сьвятым." Яны, зышоўшыся разам, пыталіся ў Яго: "Госпадзе, ці ня ў гэтым часе адбудуеш валадарства Ізраіля?" А Ён адказаў ім: "Ня вам ведаць час і пару, якія Айцец устанавіў сваёй уладаю, але, калі зыдзе на вас Дух Сьвяты, атрымаеце Ягоную сілу і будзеце Мне сьведкамі ў Ерусаліме, і ва ўсёй Юдэі, і Самарыі, і аж да краю зямлі." Пасьля гэтых словаў Ён узьнёсься ў іхняй прысутнасьці, і хмара закрыла Яго ад іхніх вачэй. Калі яны ўсё яшчэ ўзіразліся ў Яго, як Ён узьнімаўся да неба, прыступіліся да іх два мужы ў белых вопратках і сказалі: "Мужы галілейскія, чаго стаіце і глядзіце на неба? Той Ісус, які быў узяты ад вас на неба, прыйдзе зноў гэтаксама, як вы бачылі Яго, калі Ён узьнімаўся на неба." Тады яны вярнуліся ў Ерусалім з гары, што называлася Аліўнаю і была недалёка ад Ерусаліму, у адлегльсьці суботняй хады. (*1:1-12*)

**Алілуя** (*Пс. 46:5,2*). Бог узьнёсься пад радасныя воклікі, Госпад — пад гучаньне трубаў.

*Верш.* Усе народы, пляскайце ў далоні, усклікніце Госпаду радасным голасам.

**Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле Лукі**

У той час Ісус уваскрос з мёртвых і стаў сярод вучняў сваіх, кажучы ім: "Мір вам." А яны сумеліся і спалохаліся, думаючы, што бачаць здань. Але Ён сказаў ім: "Чаго вы сумеліся і чаму ўсумніліся ў вашых сэрцах? Паглядзіце на Мае рукі і ногі: гэта Я. Дакраніцеся да Мяне і пераканайцеся: дух ня мае цела і касьцей, а Я, як бачыце, маю." Сказаўшы гэта, Ён паказаў ім свае рукі і ногі. Калі ж ад радасьці яны ўсё яшчэ ня верылі і дзівіліся, Ён сказаў ім: "Ці маеце што есьці?" Яны далі Яму кавалак печанай рыбы і мёду ў сотах. Ён узяў і еў перад імі. Потым сказаў ім: "Вось тое, што Я вам казаў, калі яшчэ быў з вамі: што трэба было, каб спраўдзілася ўсё, што напісана пра Мяне ў Майсеевым Законе, у Прарокаў і ў Псалмах." Тады адкрыў ім розум для разуменьня Пісаньняў. І сказаў: "Так напісана: трэба, каб Хрыстос пацярпеў і ўваскрос з мёртвых на трэці дзень; і каб у Імя Ягонае было абвешчана пакаяньне дзеля адпушчэньня грахоў для ўсіх народаў, пачынаючы ад Ерусаліму. Вы сьведкі гэтаму. І вось пасылаю вам абяцанае Айцом Маім. Вы ж заставайцеся ў горадзе, пакуль не апранецеся

ў сілу з вышыні." Тады вывеў іх з гораду ў Бэтанію і, узьняўшы рукі, блаславіў іх. І вось, калі бласлаўляў, Ён аддаліўся ад іх і быў узьняты на неба. А яны пакланіліся Яму і з вялікай радасьцю вярнуліся ў Ерусалім, дзе ўвесь час прабывалі ў сьвятыні, славячы Бога. *(24:36-53)*

Задастойнік: Узьвялічвай, душа мая, Хрыста Жыцьцядаўца, які ўзьнёсься ад зямлі на неба.

Цябе, Маці Божую, што, вышэй за ўсякія словы і розум, у невыказны спосаб нарадзіла ў часе Спрадвечнага, мы, верныя, аднадушна ўзьвалічваем.

Прычасьнік: Бог узьнёсься пад радасныя воклікі, Госпад — пад гучаньне трубаў.

Замест "Мы бачылі...": Узьнёсься Ты ў славе, Хрысьце Божа наш, узрадаваўшы вучняў Тваіх абяцаньнем Сьвятога Духа, і ўмацаваўшы іх Тваім блаславеньнем, бо Ты — Сын Божы, Збавіцель сьвету.

# ЗЫХОД СЬВАТОГА ДУХА
# (СЁМУХА)

## ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 1).* Сьвяткуем Сёмуху і прыйсьце Духа, і спаўненьне абяцаньня, і надзеі зьдзяйсьненьне, і тайну вялікую і пачэсную. Дык усклікнем: "Творча ўсіх Госпадзе, слава Табе!" *(Двойчы)*

Рознымі мовамі надзяліў Ты, Хрысьце, сваіх вучняў, каб на іх яны прапаведавалі Цябе — Несьмяротнае Слова і Бога, які дае душам нашым багацьце зьмілаваньня.

Усё дае Дух Сьвяты, прароцтвы крынічыць, сьвятароў дасканалымі чыніць, нявучаных навучае мудрасьці, рыбакоў багасловамі робіць, і яднае ўсю царкоўную супольнасьць. Адзінасутны і роўны славаю з Айцом і Сынам Пацяшыцелю, слава Табе!

*(Тон 2).* Мы бачылі праўдзівае сьвятло, прынялі Духа нябеснага, знайшлі веру праўдзівую: пакланяемся неразьдзельнай Тройцы, бо Яна нас збавіла. *(Двойчы)*

Праз прарокаў Ты абвясьціў нам шлях збаўленьня, і праз апосталаў зазьзяла нам, Збавіцелю, ласка Духа Твайго: Ты — Бог першы і апошні, і на вякі Ты Бог наш.

У доме Тваім, Збавіцелю сьвету, буду ў песьнях славіць Цябе і, укленчыўшы, пакланюся Тваёй непераможнай сіле; увечары, раніцай і апоўдні, і ў кожны час буду бласлаўляць Цябе, Госпадзе.

У доме Тваім, Госпадзе, мы верныя, укленчым душою і целам і ўсхвалім у песьнях Цябе, беспачатнага Айца, і аднолькава беспачатнага Сына, і спрадвечнага ўсесьвятога Духа, які прасьвятляе і асьвячае душы нашыя.

Тройцу сьвятую ў песьнях уславім, Айца і Сына разам з Духам Сьвятым, бо так прапаведавалі ўсе прарокі і апосталы разам з мучанікамі.

Слава... цяпер...

*(Тон 8).* Прыйдзіце, людзі, паклонімся Богу ў трох асобах — Сыну з Айцом і з Духам Сьвятым. Спрадвечны Айцец родзіць спрадвечнага і раўнапасаднага Сына, і Дух Сьвяты праслаўляецца ў Айцу разам з Сынам: адна сіла, адна сутнасьць, адно Боства. Яму мы пакланяемся, кажучы: Сьвяты Божа, што ўсё творыш праз Сына Духам Сьвятым; Сьвяты Моцны, які даў нам пазнаць Айца, і праз якога Дух Сьвяты на сьвет прыйшоў; Сьвяты Несьмяротны, Духу Пацяшыцелю, што ад Айца паходзіш і ў Сыне спачываеш, Тройца Сьвятая, слава Табе.

**Чытаньне кнігі Лікаў** (*11:16-17; 24-29*)

Сказаў Госпад Майсею: Пакліч мне семдзесят мужоў спасярод старэйшых Ізраіля, якіх ты ведаеш, што яны — старэйшыя і праваднікі народу; і прывядзі іх да Шатра Сустрэчы, хай яны там стануць разам з табою. Тады Я прыйду і буду гутарыць з табою; і вазьму ад Духа, што ў табе, і дам ім, і яны разам з табою будуць насіць цяжкасьці народу, а ты сам ня будзеш больш насіць іх. Майсей сабраў семдзесят старэйшых народу і паставіў іх вакол шатра. І Госпад у хмары зышоў і гутарыў з ім. Пасьля ўзяў ад Духа, што быў у ім, і даў Яго гэтым сямідзесяці старэйшым. Як толькі спачыў на іх Дух, яны ўвайшлі ў той час у захапленьне і прарочылі. Два мужы засталіся ў стане, адзін з іх называўся Эльдад, а другі Мадад. На іх тасама зышоў Дух, бо яны былі ў ліку пакліканых, толькі не прыйшлі да шатра. І яны таксама пачалі прарочыць у стане. Прыбег юнак і сказаў Майсею: "Эльдад і Мадад увайшлі ў захапленьне прароцкае." Ісус, сын Навін, які з маладых гадоў быў на службе ў Майсея, узяў голас і сказаў: "Майсею, гаспадару мой, забарані ім!" Але Майсей адказаў: "Ці не зайздросны ты за мяне? О, каб усе ў народзе Гасподнім былі прарокамі, каб Госпад даў ім Духа свайго! "

**Чытаньне кнігі прарока Яэля** (*2:23-3:5*)

Так кажа Госпад: "Радуйцеся, сыны Сыёну, цешцеся ў Богу Госпадзе вашым, бо Ён учыніў вам згодна са справядлівасьцю. Дождж асеньні і дождж веснавы Ён выліў на вас шчодра, як і раней. Гумны вашыя напоўняцца збожжам, і прэсы вашыя вінаградным сокам і аліваю. У такі спосаб Я ўзнагароджу вас за гады, калі ўсё паела шаранча, чэрві, жукі і вусені, якіх Я паслаў на вас у вялікім мностве. Тады сапраўды будзеце есьці і насыціцеся, і будзеце хваліць імя Госпада Бога вашага, які ўчыніў вам дзіўныя рэчы, і народ мой ня будзе пасаромлены давеку. У той час пазнаеце, што Я ёсьць сярод Ізраіля, і што Я — Госпад Бог ваш, а іншага няма. Мой народ ня будзе пасаромлены давеку. Пасьля гэтага вылью Духа майго на кожнае цела, і сыны і дочкі вашыя будуць прарочыць, а юнакі вашыя будуць бачыць аб'яўленьні. Нават на нявольнікаў і нявольніцаў вылью Духа майго ў тыя дні. І пакажу знакі на небе і на зямлі, кроў і агонь, і стаўпы дыму. Сонца зьменіцца ў цемру, а месяц — у кроў, калі прыйдзе дзень Гасподні, дзень вялікі і страшны. Кожны аднак, хто пакліча імя Гасподняе, будзе збаўлены."

**Чытаньне кнігі прарока Эзакіеля** (*36:24-28*)

Так кажа Госпад: "Забяру вас спасярод народаў, зьбяру з усіх краінаў і прывяду зноў у вашу краіну. Акраплю вас чыстай вадою, каб вы ачысьціліся ад усякай нячыстасьці, і ад усіх ідалаў вашых ачышчу вас. І дам вам новае сэрца і новага духа ўдыхну ў нутры вашыя, каменныя сэрцы забяру з целаў вашых, а дам вам сэрцы цялесныя. Духа Майго хачу ўдыхнуць у вас і зрабіць, каб вы жылі паводле Маіх запаветаў, захоўвалі мае прыказаньні і чынілі згодна з імі. Тады будзеце жыць у краіне, якую Я даў айцом вашым, і будзеце маім народам, а Я буду вашым Богам."

**Ліцьця**

*(Тон 2).* Праз прарокаў Ты абвясьціў ... **У доме Тваім, Збавіцелю сьвету...** У доме Тваім, Госпадзе... *(Гл. с. 74)*

Слава... цяпер...

*(Тон 8).* Калі Ты, Госпадзе, паслаў Духа Твайго сабраным апосталам, тады сыны ізраільскія здумеліся, бо чулі, як тыя гава-рылі рознымі мовамі, як Дух ім падказваў. Нявучаныя, яны сталіся мудрымі і прывялі народы да веры, прапаведуючы Бога. Дзеля гэтага і мы Табе пяём: "Госпадзе, што зьявіўся на зямлі і ад маны выбавіў нас, слава Табе!"

**Вершапесьні**

*(Тон 6).* Народы, Госпадзе, не зразумелі сілы Ўсесьвятога Духа, які спачыў на Тваіх апосталах, і прынялі іхнюю здольнасьць гаварыць рознымі мовамі за пахмельле. Мы ж, умацаваныя імі, няспынна клічам: "Духа Твайго Сьвятога не адымі ад нас, молімся Табе, Чалавекалюбча!"

*Верш.* Сэрца чыстае ствары ўва мне, Божа, і дух правы абнаві ў нутры маім.

Дух Твой Сьвяты, Госпадзе, прыйшоў і напоўніў апосталаў Тваіх, і навучыў іх гаварыць рознымі мовамі. Для няверных гэты цуд выдаўся пахмельлем, а для верных ён стаўся крыніцай збаўленьня. Дык і нас зрабі годнымі Ягонага прасьвятленьня, молімся Табе, Чалавекалюбча.

*Верш.* Не адкінь мяне ад аблічча Твайго, і Духа Твайго Сьвятога не адымі ад мяне.

Уладару Нябесны, Пацяшыцелю, Духу праўды, Ты ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і жыцьця Падаўча! Прыйдзі і пасяліся ў нас і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў, Добры, душы нашыя.

Слава... цяпер...

*(Тон 8).* Некалі, у адказ на дзёрзкі намер будовы вежы, Госпад зьмяшаў мовы. Цяпер у разнастайнасьці моваў Ён даў пазнаць славу сваю. Тады Бог асудзіў нязбожных за грэх, а цяпер прасьвятліў рыбакоў Духам. Тады шматмоўе было пакараньнем, а цяпер сугучнасьць моваў была адноўленая для збаўленьня душ нашых.

**Адпушчальны трапар**

*(Тон 8).* Блаславёны Ты, Хрысьце Божа наш, што рыбакоў напоўніў мудрасьцю, паслаўшы ім Духа Сьвятога, і праз іх улавіў увесь сусьвет. Чалавекалюбча, слава Табе. (*Тройчы*)

**Водпуст.** Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які ў выглядзе вогненных языкоў паслаў з неба Усесьвятога Духа на сьвятых сваіх вучняў і апосталаў, малітвамі найчыстае свае Маці, сьвятых, слаўных і годных пахвалы апосталаў Пятра і Паўла і ўсіх сьвятых апосталаў, і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## ЮТРАНЬ

**Трапар** *(тон 8).* Блаславёны Ты, Хрысьце Божа наш....(*Тройчы*)

**Сядальная песьня 1** *(тон 4).* Сёньня сьвяткуем заключную ўрачыстасьць — Пяцідзесятніцу, — і спаўненьне абяцаньня, што было нам дадзенае. У гэты дзень Пацяшыцель зышоў на зямлю ў выглядзе вогненных языкоў. Ён прасьвятліў вучняў і адкрыў ім нябесныя тайны. Сьвятло Пацяшыцеля прыйшло і прасьвятліла сьвет. (*Двойчы*)

**Сядальная песьня 2** *(тон 5).* Крыніца Духа зышла на людзей вогненымі ручаямі; яна арасіла апосталаў сьвятлом. Дождж з вогненнай хмары іх асьвяціў. Праз іх і мы агнём і вадою прынялі ласку, бо сьвятло Пацяшыцеля прыйшло і прасьвятліла сьвет. (*Двойчы*)

**Узьвялічваньне пасьля паліелею.** Узьвялічваем Цябе, Жыцьцядаўча Хрысьце, і славім Сьвятога Духа Твайго, якога Ты ад Айца паслаў боскім вучням Тваім.

*Верш 1.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

*Верш 2.* Пасылаеш духа Твайго, і яны ажываюць, і Ты абнаўляеш твар зямлі.

*Верш 3.* Госпад сілу людзям сваім дае, Госпад бласлаўляе людзей сваіх супакоем.

Слава... цяпер...

Алілуя, алілуя, алілуя. Слава Табе, Божа! (*Тройчы*)

**Сядальная песьня 3** *(тон 8).* Пасьля ўваскрасеньня з магілы і боскага ўзьнясеньня на вышыню нябесную, Ты, Хрысьце Збавіцелю, явіў славу Тваю, дух правы абнавіўшы ў вучнях Тваіх. І яны, быццам стройныя гусьлі, згодна аб'явілі, Шчодры, Тваё навучаньне і Твой провід.

***Узыходная песьня: першы антыфан 4 тону.***

**Пракімен.** Хай Дух Твой добры вядзе мяне па правым шляху.

*Верш.* Госпадзе, пачуй малітву маю, будзь уважлівы да просьбы маёй у праўдзе Тваёй, і выслухай мяне.

**Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле Яна**

Вечарам таго самага першага дня тыдня, калі дзьверы дому, дзе сабраліся вучні, былі зачыненыя дзеля страху перад гэбрэямі, прыйшоў Ісус, стаў пасярэдзіне і сказаў ім: "Мір вам." Сказаўшы гэта, паказаў ім рукі свае і бок. І ўсьцешыліся вучні, убачыўшы Госпада. А Ісус сказаў ім ізноў: "Мір вам! Як паслаў Мяне Айцец, так Я пасылаю вас." Сказаўшы гэта, дыхнуў на іх і сказаў: "Прыміце Духа Сьвятога. Каму адпусьціце грахі, таму будуць адпушчаныя, а каму затрымаеце, на тым застануцца." (*20:19-23*)

*"Уваскрасеньне Хрыстова..." не сьпяваецца. Пасьля Пс 50:*

Слава...: Малітвамі апосталаў...

Цяпер...: Малітвамі Багародзіцы...

**Зьмілуйся над намі, Божа...:** Уладару Нябесны... *(Гл. с. 76)*

## КАНОНЫ

### Песьня 1

*Канон 1 (тон 7). Ірмас.* **Пяём** Таму, хто **ў моры патапіў фараона з** калясьніцамі **і моцнай** рукою скрышыў тых, **што шукалі вайны, бо Ён** праславіўся.

Ты, чалавекалюбны Хрысьце, паслаў вучням Тваім Духа Пацяшыцеля, як абяцаў, і прасьвятліў увесь сьвет

Сёньня споўнілася прадказанае некалі Законам і прарокамі: сёньня зазьзяла ўсім верным ласка Боскага Духа.

*Канон 2 (тон 4). Ірмас.* Агорнуты боскай хмараю, заіклівы Майсей абвясьціў Богам напісаны закон; страсянуўшы твань з вачэй сэрца свайго, ён убачыў Таго, хто ёсьць, і, навучаны Духам розуму, усхваліў Яго ў натхнёных песьнях.

Пачэсныя і чыстыя вусны сказалі: "Ня будзе разлучэньня, прыяцелі мае! Сеўшы разам з Айцом на пасадзе, вылью на тых, што жадаюць, шчодрую ласку Духа."

Слова праўдзівае перайшло мяжу і споўніла жаданьні ціхага сэрца. Скончыўшы сваю справу, Хрыстос усьцешыў прыяцеляў сваіх, калі даў ім моцным подыхам абяцанага Духа ў выглядзе вогненных языкоў.

*Катавасія: ірмасы абодвых канонаў.*

### Песьня 3

*Канон 1 (Тон 7). Ірмас.* Ты, Хрысьце, сказаў вучням Тваім: "Заставайцеся ў Ерусаліме, пакуль не атрымаеце сілы з вышыні. Я пашлю вам узамен за Мяне іншага Пацяшыцеля, Духа Майго і Айцовага, якім вы ўмацуецеся."

Сіла Духа, што зышла з вышыні, злучыла ў суладнае адно мовы, што некалі былі разьдзеленыя праз злую змову, і навучыла верных разуменьню Тройцы, якою ўмацоўваемся.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Некалі пакорлівая малітва прарочыцы Ганны ў скрусе сэрца да Ўсемагутнага Бога разьвязала путы няплоднага ўлоньня, і пасароміла гордасьць і пыху пладавітае.

Недасяжная моц Божая найсьцем Духа ўчыніла някніжных рыбакоў мудрымі настаўнікамі, што словам выбаўляюць з беспрасьветнай бездані людзей.

Асьляпляльнае Сьвятло зьявілася, і вогненны голас на Сыёне аб'явіў людзям, што гэта зьзяньне існасьці Айца, якое зыходзіць ад Яго праз Сына.

**Сядальная песьня** *(тон 8).* Прыяцелі Збавіцеля напоўніліся радасьцю і, баязьлівыя раней, сталіся сьмелымі: бо Дух Сьвяты зышоў сёньня з вышыні на дом, дзе былі вучні, і кожны з іх пачаў гаварыць рознымі мовамі да людзей. Вогненныя языкі зышлі на іх і не апалілі, але асьвяжылі іх, быццам расою.

**Песьня 4**

*Канон 1 (Тон 7). Ірмас.* У прадбачаньні Твайго, Хрысьце, апошняга прыйсьця, прарок усклікнуў: "Я ўбачыў, Госпадзе, сілу Тваю, бо Ты прыйшоў збавіць усіх памазанцаў Тваіх."

Бог, сапраўдны Пацяшыцель, які гаварыў праз прарокаў і некалі аб'явіў недасканалым людзям закон, сёньня даецца слугам і сьведкам Слова.

Дух быў дадзены разьдзельна апосталам у выглядзе полымя, як адбітак Боскай пячаці, і аб'явіўся ім у дары розных моваў. Ён — Боская ўладарная сіла, што ад Айца выходзіць.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Ты, Уладару ўладароў, Адзіны ад Адзінага, Слова, што выходзіць ад Айца беспачатнага, паслаў раўнамоцнага Твайго Духа апосталам Тваім, якія Табе як Дабрачынцу пяюць: "Слава сіле Тваёй, Госпадзе!"

Прыгатаваўшы словам адным купелю адраджэньня для сатлелай прыроды, Ты, Слова Божае, праліў на мяне струмень нятленнасьці з прабітага боку Твайго і запячатаў цеплынёю Духа.

Усе схіляюцца перад Пацяшыцелем, Сынам Айца, зьедналым прыродаю з Айцом, і вызнаюць у трох асобах адну Існасьць, недаступную, вечную і адзіную: бо зазьзяла на ўвесь сьвет ласка Духа.

Усе слугі Трысьвятое існасьці, напоўніцеся Божай сілаю: Дабрачынца наш Хрыстос звышпрыродна робіць нас дасканалымі і ўзбуджае жаданьне збаўленьня ласкаю Духа.

**Песьня 5**

*Канон 1 (Тон 7). Ірмас.* Дух збаўленьня некалі аб'явіўся на зямлі праз прарокаў, якія прынялі Яго ва ўлоньні сваім у страху Тваім;. цяпер Ён робіць чыстымі сэрцы апосталаў, і абнаўляе дух правы ў сэрцах верных, для якіх прыказаньні Твае, Госпадзе — сьвятло і супакой.

Сіла добрага Духа зышла на нас сёньня — Духа мудрасьці Божай, Духа, што ад Айца выходзіць і аб'яўляецца праз Сына ўсім верным, і, пасяліўшыся ў іх, зьдзяйсьняе сьвятасьць, у якой бывае пазнавальны.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Як дасканалае ачышчэньне грахоў, прыміце, сьветлыя дзеці Царквы, палымяную расу Духа. Сёньня з Сыёну выйшлі новы закон і ласка Духа ў выглядзе вогненных языкоў.

Дух уладарны зыходзіць ад Айца і навучае мовам апосталаў. Ён накладае пячаць на жыцьцядайныя словы Збавіцеля, бо мае сілу і прыроду Айца.

Бог-Слова, пачатак усяго, што існуе, ачысьціў душы нашыя ад граху, і ўчыніў апосталаў беззаганным жыльлём, у якім сьветласьць раўнамагутнага і адзінасутнага Ягонага Духа сёньня пасяляецца.

**Песьня 6**

*Канон 1 (Тон 7). Ірмас.* Топячыся ў марнасьці жыцьцёвых клопатаў з караблём, поўным грахоў, я трапіў у пашчу душагубнага зьвера і, як некалі Ёна, клічу: "Са сьмяротнай бездані выратуй мяне!"

Ты, Госпадзе, выліў Духа Твайго шчодра на кожнае цела, як абяцаў, і ўсе зразумелі, што Ты — Сын, які спрадвеку нярэчыўна нарадзіўся ад Айца, і што Дух ад Яго неразьдзельна зыходзіць .

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Ты, Хрысьце Ўладару, нашае ачышчэньне і збаўленьне, зазьзяў ад Дзевы і, быццам прарока Ёну з нутра марскога зьвера, вызваліў ад тленнасьці ўвесь заняпалы Адамаў род.

Аднаві, Усемагутны, у душах нашых, пакліканых да несьмяротнасьці, Дух правы, да якога імкнемся; Дух, вечна зьяднаны з Айцом, ад якога зыходзіць; Дух, які паліць ненавісныя заганы рэчыўнае прыроды і ачышчае пачуцьці.

Дух, сьведка народжанага ад Айца Слова, умацоўвае вогненным подыхам пабожнасьць апосталаў, што сабраліся на Сыёне ў чаканьні Ягонага прыйсьця, і выкрывае хлусьню вучэньняў паганскага збору.

**Кандак** *(тон 8).* Калі Ўсявышні, зышоўшы, мовы зьмяшаў, Ён разьдзяліў між сабой народы; калі ж паслаў вогненныя языкі, да еднасьці ўсіх паклікаў. Дзеля гэтага мы ўсе згодна славім Усесьвятога Духа.

*Ікас.* Хуткае і пэўнае дай пацяшэньне слугам Тваім, Ісусе, калі душы нашыя сумуюць; не адыходзь ад душаў нашых у тузе, не аддаляйся ад думак нашых у няшчасьцях, але заўжды сьпяшайся нам на дапамогу. Будзь з намі, блізка будзь, Усюдыпрысутны. Як Ты заўсёды быў з Тваімі апосталамі, так і тых, што жадаюць Цябе, злучы з сабою, Усядобры; каб, зьяднаныя з Табою, мы славілі ў песьнях Усесьвятога Духа.

**Песьня 7**

*Канон 1 (Тон 7). Ірмас.* Укінутыя ў вогненную печ, набожныя юнакі агонь на расу перамянілі і пяялі: "Блаславёны Ты, Божа айцоў нашых!"

Няверным здавалася, што апосталы, якія прапаведавалі веліч Божую, былі п'яныя. Не зразумелі яны дзеяньня Духа Сьвятога, дзякуючы якому пазнаецца Тройца, адзіны Бог айцоў нашых.

Прававерна вызнаем непадзельную існасьць Бога Айца спрадвечнага, і адзінасутнага з Ім Слова і Духа, і клічам: "Блаславёны Ты, Божа айцоў нашых!"

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Гучаньне музыкі клікала на пакланеньне залатому бяздушнаму ідалу. Праменная ж ласка Пацяшыцеля ўздымае нас, і мы ўсклікаем: "Тройца адзіная, раўнасільная, беспачатная, блаславёная Ты!"

Неразумныя не пазналі прарочых прадказаньняў і, пачуўшы дзіўныя словы ад апосталаў, думалі, што тыя ўпіліся віном. Мы ж пабожна клічам: "Дабрачынца ўсіх, блаславёны Ты!"

Яэль у натхненьні загрымеў магутным і богаўладным словам, кажучы: "Тыя, на каго вылью Духа Майго, усклікнуць: "Трохпраменная існасьць, блаславёная Ты!"

Трэцяя гадзіна ўдастоілася ласкі явіць тры Асобы ў адзінстве існасьці Божай, і таму мы ў гэты дзень Гасподні клічам: "Ойча, Сыне і Духу — Божа, блаславёны Ты!"

**Песьня 8**

*Канон 1 (Тон 7). Ірмас.* Ахоплены агнём на Сынаі куст, што не згараў, аб'явіў Бога заікліваму Майсею; а руплівасьць Божая паказала непераможнымі трох юнакоў, якія пялі: "Усе творы Гасподнія, слаўце Госпада і ўзьвялічвайце Яго праз усе вякі!"

Калі жыцьцядайны подых Усесьвятога Духа вогненнымі языкамі з вялікім шумам зышоў з неба на рыбакоў, яны пачалі прапаведаваць веліч Божую і клікалі: "Усе творы Гасподнія, слаўце Госпада і ўзьвялічвайце Яго праз усе вякі!"

Як тыя, што не баяццца агню і падыходзяць да недатыкальнай гары, хадзіце, станем на гары Сыёнскай, у горадзе Бога жывога, і злучым нашыя галасы з вучнямі, што, поўныя Духа Сьвятога, пяюць: "Усе творы Гасподнія, слаўце Госпада і ўзьвялічвайце Яго праз усе вякі!"

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Тройчы сьветлы вобраз Боскай велічы разрывае путы і вылівае расу на полымя. Юнакі славяць Яго і ўсё стварэньне блаславўляе, як Дабрачынца, адзінага Збавіцеля і Творцу ўсяго.

Ты, Хрысьце, пасылаеш апосталам Духа ў выглядзе вогненных языкоў, каб умацаваць у іхняй памяці словы, якія Ты чуў ад Айца і ім перадаў. І ўсё стварэньне славіць Цябе.

Ты прыйшоў самаўладна для нашага збаўленьня і, як Сьвятло і Падавец сьвятла, спаўняеш Тваё абяцаньне і даеш апосталам і прыяцелям Тваім Духа, які ўсё напаўняе.

Натхнёныя вусны прарокаў прапаведавалі Тваё прыйсьце ў целе, Уладару, і Дух, што з улоньня Айца паходзіць, нястбораны, раўнапасадны і раўнатворчы з Табою, сьведчыць верным пра Тваё ўчалавечаньне.

*"Больш годную пашаны..." не сьпяваецца.*

**Песьня 9**

*Канон 1 (Тон 7). Ірмас.* Узьвялічваем Цябе, што засталася нятленнаю пасьля родаў і дала цела Слову ўсемагутнаму, Маці беззаганная, Дзева Багародзіца, Умяшчальніца Незьмяшчальнага Творцы Твайго.

Некалі руплівец Ільля, які узьнёсься радасна на вогненнай калясьніцы, быў вобразам вогненнага дыханьня, што сёньня зышло на апосталаў. Асьвячаныя Ім, яны прапаведавалі ўсім Тройцу.

Дзіўныя надпрыродныя рэчы сталіся з вучнямі. Яны прамаўлялі аднагалосна ласкаю Духа Сьвятога, і усе людзі чулі, кожны ў сваёй мове, прапаведаваньне велічы Божай, і прыходзілі да пазнаньня Тройцы.

*Канон 2 (Тон 4). Ірмас.* Радуйся, Уладарка, пахвала дзеваў і матак; ніякія красамоўныя вусны ня ў стане дастойна ўславіць Цябе, і розум бясьсільны зразумець сынараджэньне Тваё. Дзеля гэтага мы ўсе суладна Цябе славім.

Дастойна ёсьць славіць Дзеву Карміцельку: Яна, адзіная сярод жанчынаў, мела ва ўлоньні Слова, якое ацаліла хворую людзкую прыроду, а цяпер сядзіць па правай руцэ Айца і пасылае нам ласку Духа.

Усе мы, на каго Боская ласка дыхнула з вышыні, зьмяніліся, сталіся сьветлымі і, назіраючы раўнасільную неразьдзельную мудрасьць, славім Трысьветлую Існасьць.

Экзапастыляр *(тон 3).* Усесьвяты Духу, што ад Айца праз Сына зышоў на нявучаных апосталаў, збаў і асьвяці ўсіх, што пазналі Цябе як Бога.

Слава... цяпер...

Сьвятло Айцец, Сьвятло Слова, Сьвятло і Дух Сьвяты, які быў пасланы ў выглядзе вогненных языкоў на апосталаў, і які прасьвятляе сьвет і навучае славіць Сьвятую Тройцу.

**Пахвальныя псалмы**

*(Тон 4).* Слаўныя рэчы бачылі сёньня ўсе народы ў месьце Давідавым, калі Дух Сьвяты зышоў у выглядзе вогненных языкоў, як расказвае Богам натхнёны Лука: "Калі вучні Хрыстовыя сабраліся, пачуўся шум, быццам подых буры, і напоўніў дом, дзе яны сядзелі; і ўсе пачалі абвяшчаць на розных мовах дзіўныя вучэньні, дзівосную хвалу Ўсесьвятой Тройцы." *(Двойчы)*

Дух Сьвяты заўсёды быў, і ёсьць, і будзе; Ён ня мае ні пачатку ні канца, але заўжды з Айцом і Сынам зьяднаны і адзінасутны. Ён — Жыцьцё і Творца жыцьця; Ён Сьвятло і Падавец сьвятла, сам Добры і Крыніца дабра. Праз Яго мы пазнаем Айца, і Сына праслаўляем, і вызнаем адзіную сілу, адзіную годнасьць, адзіную хвалу Сьвятой Тройцы.

Дух Сьвяты — Сьвятло і Жыцьцё. Ён жыве і крынічыць жыцьцё; Дух разважнасьці, Дух розуму; добры, правы, мудры; Ён усім кіруе і ачышчае

правіны. Ён Бог і Той, хто абагаўляе; Агонь, што ад Агню паходзіць; Ён прамаўляе, дае і разьдзяляе даравадьні. Прарокі ўсе праславіліся Ім, разам з боскімі апосталамі і мучанікамі. Дзіўныя рэчы чуем, дзівосныя рэчы бачым: агонь разьдзяляецца, каб раздаваць дары.

Слава... цяпер....

(*Тон 6*). Уладару Нябесны, Пацяшыцелю, Духу праўды, Ты ўсюды прысутны і ўсё напаўняеш, Скарбніца дабра і жыцьця Падаўча! Прыйдзі і пасяліся ў нас і ачысьці нас ад усяго благога, і збаў, Добры, душы нашыя.

*Пасьля Вялікага ўслаўленьня :*

Трапар (*тон 8*). Блаславёны Ты, Хрысьце Божа наш, што рыбакоў напоўніў мудрасьцю, паслаўшы ім Духа Сьвятога, і праз іх улавіў увесь сусьвет. Чалавекалюбча, слава Табе. (*Тройчы*)

*Далей звычайнае заканчэньне сьвяточнай ютрані.*

Водпуст. Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які ў выглядзе вогненных языкоў паслаў з неба Усесьвятога Духа на сьвятых сваіх вучняў і апосталаў, малітвамі ўсячыстае свае Маці, сьвятых, слаўных і годных пахвалы апосталаў Пятра і Паўла і ўсіх сьвятых апосталаў, і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## ЛІТУРГІЯ

**Першы антыфан** (*Пс 18:2,3,5*)

**Чытальнік**: Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

Людзі: Малітвамі Багародзіцы, Збавіцелю, збаў нас. (*Так пасьля наступных вершаў*)

**Чытальнік**: Дзень дню кажа слова, ноч ночы вестку перадае.

— Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

— Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

Людзі: Малітвамі Багародзіцы...

**Другі антыфан** (*Пс 19:2,3,5*)

**Чытальнік**: Хай пачуе цябе Госпад у дзень суму, хай імя Бога Якубавага будзе Табе абаронаю.

Людзі: Пацяшыцелю добры, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя. (*Так пасьля кожнага наступнага верша*)

**Чытальнік**: Хай пашле табе дапамогу са сьвятыні сваёй, хай дасьць падтрымку табе з Сыёну.

— Хай споўніць Госпад жаданьне сэрца твайго, хай зьдзейсьніць усе задумы твае.

Людзі: Пацяшыцелю добры ...

Слава... цяпер... Адзінародны Сыне і Слова Бога...

**Трэці антыфан** (*Пс. 20:2,3,4*)

**Чытальнік:** Госпадзе, сілаю Тваёю цешыцца ўладар, і дапамога Твая напаўняе яго радасьцю.

Людзі: *(Тон 8)* Блаславёны Ты, Хрысьце Божа наш, што рыбакоў напоўніў мудрасьцю, паслаўшы ім Духа Сьвятога, і праз іх улавіў увесь сусьвет. Чалавекалюбча, слава Табе. (*Так пасьля наступных вершаў*)

**Чытальнік:** Ты споўніў жаданьне сэрца яго і не адмовіў просьбе вуснаў ягоных.

— Ты выйшаў яму насустрач са шчодрым блаславеньнем і ўсклаў на галаву ягоную вянец з чыстага золата.

**Сьвятар** (*уваходны верш*): Узьнясіся, Госпадзе, у сіле Тваёй: будзем пяяць і славіць магутнасьць Тваю.

Людзі: Пацяшыцелю добры, збаў нас, якія пяём Табе: Алілуя.

**Трапар** *(тон 8)*. Блаславёны Ты, Хрысьце Божа наш, што рыбакоў напоўніў мудрасьцю, паслаўшы ім Духа Сьвятога, і праз іх улавіў увесь сусьвет. Чалавекалюбча, слава Табе.

Слава... цяпер...

**Кандак** *(тон 8)*. Калі Ўсявышні, зышоўшы, мовы зьмяшаў, Ён разьдзяліў між сабой народы; калі ж паслаў вогненныя языкі, да еднасьці ўсіх паклікаў. Дзеля гэтага мы ўсе згодна славім Усесьвятога Духа.

**Замест "Сьвяты Божа."** Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся. Алілуя. (*Тройчы*)
Слава... цяпер...
У Хрыста апрануліся. Алілуя.
Усе вы, што ў Хрыста ахрысьціліся, у Хрыста апрануліся. Алілуя.

**Пракімен** *(Пс 18:5,2)*. Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.
*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

**Чытаньне Апостальскіх Дзеяньняў**

У той час, калі дзень Сёмухі набліжаўся да канца, апосталы былі сабраныя разам. І вось раптам пачуўся вялікі шум з неба, быццам ад моцнага ветру, і напоўніў увесь дом, у якім яны былі. Зьявіліся ім таксама

языкі, быццам вогненныя, якія разьдзяліліся і супачылі па адным на кожным з іх. І напоўніліся ўсе Духам Сьвятым, і пачалі размаўляць на іншых мовах, як Дух даваў ім гаварыць. Былі тады ў Ерусаліме пабожныя гэбрэі ад усіх народаў пад сонцам. Калі пачуўся той шум, яны зьбегліся ў вялікай колькасьці і здумеліся, бо кожны з іх чуў, як (апосталы) гаварылі на ягонай мове. "Ці ж гэтыя ўсе, якія гавораць, не галілейцы? — казалі яны адзін аднаму, дзівячыся. — Дык як гэта кожны з нас чуе сваю родную мову? Парты, міды і эляміты, і жыхары Мэзапатаміі, гэбрэі і тыя, што з Кападокіі, Понту і Азіі, Фрыгіі і Памфіліі, Ягіпту і частак Лібіі, што недалёка ад Кірынэі, і прыхадні з Рыму, гэбрэі і наверненыя, крыцяне і арабы — усе чуем, як яны абвяшчаюць на нашых мовах веліч Божую." (*2:1-11*)

**Алілуя** *(Пс 32:6,13).* Словам Гасподнім створаныя нябёсы, подыхам вуснаў Ягоных — уся краса іх.

*Верш.* Госпад з нябёсаў глядзіць, бачыць усіх дзяцей людзкіх.

**Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле Яна** (*7:37-52;8:12*)

У апошні, вялікі дзень сьвята Ісус стаяў і клікаў моцным голасам: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е. Хто верыць у Мяне, як кажа Пісаньне, рэкі жывой вады пацякуць з ягонага ўлоньня." Гэта Ён казаў пра Духа, якога павінны былі атрымаць тыя, што ўверылі ў Яго. Бо Дух яшчэ ня быў (дадзены), таму што Ісус ня быў яшчэ праслаўлены. Сярод натоўпу, што слухаў Яго, пачуліся галасы: "Гэта сапраўды Прарок." А іншыя казалі: "Гэта Хрыстос." Яшчэ іншыя гаварылі: "Ці ж Хрыстос прыйдзе з Галілеі? Ці ж Пісаньне не кажа, што Мэсыя прыйдзе з патомства Давідавага, з мястэчка Бэтлеему, адкуль быў сам Давід?" І пачаўся разлад у натоўпе праз Яго. Некаторыя з іх хацелі схапіць Яго, але ніхто не пасьмеў падняць на Яго рукі.

Слугі сьвятароў і фарысэяў вярнуліся, а тыя сказалі ім: "Чаму вы не схапілі Яго?" Адказалі слугі: "Ніхто яшчэ ніколі не гаварыў так, як гэты Чалавек." Адказалі ім фарысэі: "Няўжо ж і вас падманулі? Хіба хто з начальнікаў або фарысэяў уверыў у Яго? А гэты натоўп ня ведае Закону, пракляты ён." Адазваўся тады адзін з іх, Мікодым, той, што раней прыходзіў да Яго: "Хіба наш Закон асуджае чалавека, не выслухаўшы яго перш і не даведаўшыся, што ён робіць?" Адказалі яму: "Ці і ты не з Галілеі? Правер і пабач, што ніякі прарок з Галілеі не прыходзіць."

А Ісус зноў прамовіў да іх: "Я — Сьвятло сьвету. Хто ідзе ўсьлед за Мною, ня будзе хадзіць у цемры, але будзе мець сьвятло жыцьця."

**Задастойнік.** Апосталы, угледзеўшы зыход Пацяшыцеля, зьдзівіліся, як гэта ў выглядзе вогненных языкоў зьявіўся Дух Сьвяты.

Радуйся, Уладарка, пахвала матак і дзеваў: ніякія красамоўныя вусны ня здольныя дастойна ўславіць Цябе, і розум бясьсільны зразумець Твае мацярынства. Дзеля гэтага мы аднадушна Цябе ўзьвялічваем.

**Прычасьнік** *(Пс 142:10).* Хай Дух Твой добры вядзе мяне па правым шляху. Алілуя, алілуя, алілуя.

# ПАНАДЗЕЛАК СЬВАТОГА ДУХА

## ВЯЧЭРНЯ
## (у нядзелю ўвечары)

*Пачатак звычайны. На мірнай літаніі, пасьля "За падарожнікаў...." дадаюцца наступныя просьбы:*

— За прысутных тут людзей, якія чакаюць ласкі Сьвятога Духа, Госпаду памолімся.

— За тых, што перад Госпадам схіляюць сэрцы свае і калені, Госпаду памолімся.

— Каб ім умацавацца ў намеры рабіць прыемнае Богу, Госпаду памолімся.

— Каб ім атрымаць багацьце ласкаў, Госпаду памолімся.

— Каб Ён прыняў іхняе кленчаньне, быццам кадзіла духмянае, Госпаду памолімся.

— За тых, што патрабуюць Ягонай дапамогі, Госпаду памолімся.

— Каб нам выбавіцца ад усякага гневу... *і г.д.*

На "Госпадзе, Цябе клічу..." *наступныя песьні, паўтараючы кожную:*

*(Тон 4).* Слаўныя рэчы бачылі сёньня... Дух Сьвяты заўсёды быў, і ёсьць, і будзе... Дух Сьвяты — Сьвятло і Жыцьцё... *(Гл. с. 82)*

Слава... цяпер....

*(Тон 6).* Уладару Нябесны... *(Гл. с. 76)*

Пракімен вялікі *(Пс.76:14,15,11,12).* Які бог роўны веліччу Богу нашаму? Ты Бог, што чыніш цуды.
*Верш 1.* Ты паказаў сярод людзей сілу Тваю.
*Верш 2.* Я сказаў: цяпер зразумеў я, што гэта зьмена волі Ўсявышняга.
*Верш 3.* Я прыгадаў усё, што Бог учыніў, ад пачатку прыгадаў цуды Твае.

Дыякан: Яшчэ і яшчэ, укленчыўшы, Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

*Усе становяцца на калені і сьвятар чытае першую малітву:*

Сьвятар: Усячысты, беззаганны, спрадвечны, нябачны, недасяжны, недасьледны, нязьменны, непераможны, невымерны, доўгацярплівы Госпадзе! Ты, адзіны несьмяротны, прабываеш у недасяжным сьвятле; Ты стварыў неба і зямлю, і ўсе стварэньні, што жывуць там; Ты ведаеш і спаўняеш просьбы нашыя перад тым, як мы папросім. Молімся Табе і просім Цябе, чалавекалюбны Госпадзе, Ойча Госпада, Бога і Збавіцеля

нашага Ісуса Хрыста, які дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўленьня зышоў з неба і прыняў цела ад Духа Сьвятога і Заўсёды Дзевы Марыі і ўсяслаўнае Багародзіцы; які навучаў нас перш словамі, а пасьля на справе, пацяр-пеўшы збавенныя мукі; і пакінуўшы нам, пакорным, грэшным і нягодным слугам Тваім, прыклад як, схіліўшы галовы і стаўшы на калені, прыносіць Табе маленьні за свае грахі і за няведаньне людзей. Дык, міласэрны Чалавекалюбча, пачуй нас, калі мы Цябе клічам, асабліва ў гэты дзень Сёмухі, калі — пасьля таго, як Госпад наш Ісус Хрыстос узышоў на неба і сеў па правай руцэ Цябе, Бога і Айца, — Ты паслаў сьвятым Яго вучням і апосталам Духа Твайго Сьвятога, які спачыў на кожным з іх, і ўсе яны напоўніліся невычэрпнай ласкай Ягонай, і пачалі выслаўляць рознымі мовамі веліч Тваю і прарочыць. Сёньня выслухай нас, якія молімся Табе, і ўспомні нас, пакорлівых і асуджаных, і ў Тваёй міласэрнасьці вярні душы нашыя з палону граху. Прымі нас, якія прыходзім да Цябе і клічам: Зграшылі мы! Ад першай хвіліны нашай ва ўлоньні маці Ты быў нашым Богам. Але мы змарнавалі дні нашыя ў базьдзейнасьці, і таму страцілі права на дапамогу Тваю і пазбавілі сябе ўсякай абароны. Спадзеючыся аднак на Тваю дабрыню, клічам: Ня ўспомні грахоў і няведаньня маладосьці нашай, ачысьці нас ад тайных правінаў, не пакінь нас у старасьці нашай, калі сілы нашыя саслабнуць; зрабі нас годнымі вярнуцца да Цябе перад тым, як нам вярнуцца ў зямлю; і будзь уважлівы да нас у Тваёй дабрыні і спагадлівасьці. Мерай грахі нашыя мераю Тваёй міласэрнасьці, і супрацьстаў веліч дабрыні Тваёй безьлічы правінаў нашых. З вышыні жыльля Твайго глянь ласкава на людзей Тваіх, якія чакаюць Твайго вялікага зьмілаваньня. Наведай нас дабрынёю Тваёю, вызваль нас ад напасьцяў д'ябла; умацуй жыцьцё нашае Тваімі сьвятымі запаветамі і прыказаньнямі; дай кожнаму з нас анёла апекуна, зьбяры ўсіх у адно валадарства Тваё. Даруй прабачэньне тым, што спадзяюцца на Цябе, адпусьці ім і нам грахі. Ачысьці нас дзеяньнем Духа Сьвятога Твайго, зьнішчы напасьці варожыя супраць нас.

*(Іншая малітва).* Бласлаўёны Ты, Госпадзе Ўладару ўсемагутны, які прасьвятліў сонечным сьвятлом дзень і праясьніў цемру начную вогненнымі зоркамі; Ты даў нам пражыць гэты дзень і наблізіцца да пачатку ночы. Пачуй малітвы нашыя і ўсіх людзей Тваіх, і прабач нам усе нашыя правіны вольныя і міжвольныя. Прымі нашыя вячэрнія малітвы, і пашлі багацьце міласэрнасьці Тваёй і дабраты Твае на набытак Твой. Дай нам ахову анёлаў Тваіх, узброй нас у зброю справядлівасьці Тваёй, агарні нас праўдаю Тваёю, захавай нас сілаю Тваёю, выбаў нас ад усялякай нягоды і варожай напасьці. Дай, каб гэты вечар і ноч, што надыходзіць, і ўсе дні жыцьця нашага, былі дасканалымі, сьвятымі, спакойнымі, бязгрэшнымі, вольнымі ад спакусаў і нячыстых думак, малітвамі Багародзіцы і ўсіх сьвятых, якія ад веку дагадзілі Табе.

*Усе ўстаюць.*

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы ўсесьвятую, усячыстую, найблаславёную слаўную Уладарку нашу Багародзіцу і заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар: Бо Ты, Госпадзе Божа наш, той, які мілуе і збаўляе нас, і мы Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Скажам усе разам ... *І далей уся літанія. Пасьля вокліку:*

Бо Ты міласьцівы і чалавекалюбны Бог...

Людзі: Амін.

Дыякан: Яшчэ і яшчэ, укленчыўшы, Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; **Госпадзе, зьмілуйся.**

*Усе становяцца зноў на калені і сьвятар чытае другую малітву:*

Сьвятар: Госпадзе Ісусе Хрысьце, Божа наш, Ты, будучы яшчэ тут з намі, даў людзям супакой, і цяпер пасылаеш верным як неад'емную спадчыну дар Сьвятога Духа. Сёньня ж асабліва, бачным спосабам Ты паслаў гэтую ласку вучням Тваім і апосталам, і ўмацаваў вусны іх вогненнымі языкамі. Праз іх мы і ўвесь род людзкі самі пачулі Боскае навучаньне, кожны на сваёй роднай мове, былі прасьветленыя зьзяньнем Духа і адкінулі цемру спакусы. Праз разьдзяленьне бачных вогненнных языкоў і праз іх тайнае дзеяньне мы навучыліся верыць у Цябе, і бласлаўляць Цябе разам з Айцом і Сьвятым Духам, адзінае Боства і сілу, чыя магутнасьць нас азарыла. Ты — зьзяньне Айца, нязьменны і непарушны вобраз Ягонае існасьці і прыроды, крыніца мудрасьці і ласкі. Адчыні мае грэшныя вусны, і навучы мяне, як трэба маліцца і чаго прасіць. Ты ведаеш безьліч грахоў маіх, але дабрасардэчнасьць Твая пераможа іхняе мноства. Вось я стаю са страхам перад Табою, у глыбіню Тваёй міласэрнасьці кінуўшы беспрасьветнасьць душы маёй: кіруй маім жыцьцём, Ты, які словам Тваім кіруеш у невыказнай мудрасьці і сіле ўсім стварэньнем. Спакойны прыстанак для кіданых бураю, настаў мяне на шлях, па якім мне ісьці. Дай думкам маім духа мудрасьці; духа розуму даруй майму неразуменьню; духам страху Твайго пакрый мае ўчынкі, духа справядлівасьці абнаві ва ўлоньні маім, і духам уладарным умацуй хістаньне думак маіх, каб я, кожны дзень кіраваны Тваім добрым духам, рабіў добрае і карыснае, захоўваў Твае запаветы і памятаў заўсёды пра Тваё слаўнае другое прыйсьце і суд над учынкамі нашымі. І ня дай мне спакусіцца пераходнай красою гэтага сьвету, але ўмацуй мяне ў жаданьні атрымаць будучыя скарбы. Бо Ты, Уладару, сказаў, што кожны, хто просіць нешта ў імя Тваё, неадменна атрымае ад Твайго спрадвечнага Бога і Айца. Дзеля гэтага і я, грэшны, у гэты дзень прыйсьця Сьвятога

Твайго Духа, малю Тваю дабрыню даць мне ўсё патрэбнае для майго збаўленьня. Так, Госпадзе, усялякай дабрадзейнасьці шчодры і добры Падаўца, які даеш багата ўсё, чаго просім: у велічы Тваёй спагадлівасьці і міласэрнасьці Ты стаўся ўдзельнікам нашай прыроды і, як Добрасардэчны, схіляешся да тых, што схіляюцца перад Табою і, сам бязгрэшны, зрабіўся ачышчэньнем грахоў нашых. Дай, Госпадзе, людзям Тваім даброты Твае; пачуй нас з нябеснага жыльля сьвятога Твайго; асьвяці нас сілаю збавеннае рукі Тваёй; пакрый нас покрывам крылаў Тваіх і не пагардзі творамі рук Тваіх. Перад Табою адзіным мы зграшылі, і Табе адзінаму служым. Ня ведаем іншага бога і не пакланяемся яму, і не працяг-ваем рук нашых, Уладару, да чужога бога. Адпусьці нам нашыя правіны і прымі нашыя малітвы, якія мы, укленчыўшы, прыносім Табе; працягні ўсім руку дапа-могі, прымі малітву ўсіх нас, быццам кадзіла духмянае, што ўздымаецца да Твайго блаславёнага пасаду.

*(Іншая малітва).* Госпадзе, Госпадзе, Ты выбаўляеш нас ад усякае стралы, што ляціць удзень. Выбаў нас ад усякае рэчы, што крыецца ў цемры; прымі ўздыманьне рук нашых, быццам вячэрнюю ахвяру. Дай нам час начны беззаганна пражыць, неспакушанымі нічым благім; выбаў нас ад усякага замяшаньня і страху, што д'ябал пасылае нам. Даруй душам нашым расчуленасьць, і думкам нашым клопат аб выпрабаваньнях на Тваім страшным і справядлівым судзе. Прыбі да страху Твайго нашыя целы, і ўмярцьві нашыя зямныя члены, каб мы, лежачы бязмоўна ў сьне, прасьвятліліся бачаньнем судоў Тваіх. Адымі ад нас усякія непрыстойныя мары і шкодныя пажаданьні. Узьнімі нас у час на малітву, умацаваных у веры і цьвёрдых у выкананьні запаветаў Тваіх.

*Усе ўстаюць.*

Дыякан: Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас Божа, ласкаю Тваёю.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся.

Дыякан: Успамянуўшы ўсесьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар: Добразычлівасьцю і дабрынёю адзінароднага Сына Твайго, з якім блаславёны Ты і Твой усесьвяты, добры і жыцьцядайны Дух, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Чытальнік: Дай, Госпадзе, у гэты вечар захавацца нам без граху ... *і г. д.*

Дыякан: Яшчэ і яшчэ, укленчыўшы, Госпаду памолімся.

Людзі: Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся; Госпадзе, зьмілуйся.

*Усе становяцца зноў на калені і сьвятар чытае трэцюю малітву:*

Сьвятар: Вечная невычэрпная Крыніца жыцьця і сьвятла, роўнавечная Айцу творчая Сіла! Ты, Хрысьце Божа наш, споўніў дасканала ўвесь провід збаўленьня людзей, разарваў неразрыўныя путы сьмерці і разьбіў замкі пякельныя, і перамог безьліч злых духаў. Ты прынёс сябе за нас, як бязьвінную ахвяру, аддаў на мукі ўсячыстае цела Тваё, вольнае ад усякага граху і непадуладнае яму, і гэтым страшным і невыказным сьвятым учынкам дараваў нам вечнае жыцьцё. Зышоўшы ў пекла, Ты скрышыў вечныя кайданы, і тым, што сядзелі ў цемры, паказаў выхад. А пачынальніка зла, зьмея, што сядзеў у бездані, Ты паланіў багамудрай прынадаю і, спутаўшы пякельнымі ланцугамі, у бездані, у нязгасным агні і ў цемры бесправсьветнай прымацаваў бязьмернай сілаю Тваёю. Ты, вялікая мудрасьць Айца, зьявіўся памочнікам для ўсіх, што ў напасьцях, і прасьвятліў тых, што сядзелі ў цемры і ценю сьмерці. Ты, вечнай славы Госпадзе і Айца найвышэйшага любы Сыне, спрадвечнае Сьвятло ад спрадвечнага Сьвятла, Сонца справядлівасьці, пачуй нас, якія молімся Табе, і супакой душы слугаў Тваіх, раней заснуўшых айцоў і братоў нашых і ўсіх сваякоў паводле цела, і ўсіх верных, якіх сёньня ўспамінаем, бо Ты маеш уладу над усімі, і ў руцэ Тваёй трымаеш усе канцы зямлі. Уладару ўсемагутны, Божа айцоў нашых і Госпадзе міласэрны, Творча ўсяго сьмяротнага і несьмяротнага і ўсякай людзкой прыроды; усяго, што паўстае і разбураецца; жыцьця і сьмерці; прабываньня ў гэтым жыцьці і пераходу да наступнага: Ты адмерваеш гады жывым і ўстанаўляеш час сьмерці; пасылаеш у пекла і зноў узносіш; зьвязваеш у немачы і развязваеш у сіле; уладкоўваеш цяперашняе паводле патрэбы, і вызначаеш будучае на карысьць; і параненых джалам сьмерці суцяшаеш надзеяю ўваскрасеньня. Уладару ўсіх, Божа, Збавіцелю наш, надзея ўсіх канцоў зямлі і тых, што далёка на моры, Ты ў гэты апошні, вялікі і збавенны дзень сьвята Сёмухі паказаў нам тайну сьвятое, адзінасутнае і спрадвечнае, і неразьдзельнае, і нязьлітнае Тройцы, праз зыход Твайго Сьвятога і Жыватворчага Духа, якога Ты паслаў у выглядзе вогненных языкоў на сьвятых Тваіх вучняў і апосталаў, і ўчыніў іх вестунамі і вызнаўцамі нашае сьвятое веры, і прапаведнікамі сапраўднага багаслоўя. У гэтае дасканалае і збавеннае сьвята Ты захацеў ласкава прыняць ачышчальныя малітвы за зьняволеных у апраметнай, даючы нам вялікую надзею на палягчэньне лёсу тых, што там знаходзяцца, і на Тваё для іх суцяшэньне. Пачуй малітвы нас, пакорных слугаў Тваіх, і супакой душы слугаў Тваіх, што раней адышлі, у месцы сьветлым, месцы радасным, месцы прахалоды, дзе няма больш ні болю, ні суму, ні плачу; пасялі іх у сялібах праведных і зрабі іх годнымі супакою і палёгкі. Бо ня мёртвыя будуць хваліць Цябе, і ня тыя, што ў пекле, асьмеляцца вызнаваць Цябе, але мы, жывыя, бласлаўляем Цябе і молім, і ачышчальныя малітвы і ахвяры прыносім за іхнія душы.

*(Іншая малітва).* Божа вялікі і вечны, сьвяты, чалавекалюбны, Ты ўдастоіў нас у гэтую хвіліну стаць перад Тваёю недаступнаю славаю, каб славіць у песьнях і хваліць цуды Твае: ачысьці нас, нягодных слугаў Тваіх, і дай нам ласку з сэрцам скрушлівым у пакоры прыносіць Табе тройчы сьвятое ўсхваленьне і падзяку за ўсе Твае дабрадзействы, якія Ты ўчыніў і ўвесь час чыніш для нас. Памятай пра нашыя слабасьці і ня дай нам згінуць разам з нашымі беззаконьнямі; але ўчыні нам, пакорным, вялікую ласку, каб нам вызваліцца ад грахоўнай цемры і хадзіць у сьвятле праведнасьці і, апра-

нуўшыся ў зброю сьвятла, захавацца ад усялякай хітрасьці злога ворага, і адважна славіць за ўсё Цябе, адзінага сапраўднага і чалавекалюбнага Бога. Сапраўды, Уладару і Творча ўсіх, вялікая тайна часовага распаду Тваіх стварэньняў і іхняга паўторнага ўзнаўленьня, і вечнага іх супакаеньня. Мы вызнаем ласку Тваю ва ўсім: у нашым прыйсьці на гэты сьвет і ў адыходзе; у нашай надзеі ўваскрасеньня і жыцьця вечнага, якое, згодна з Тваім непарушным абяцаньнем, маем атрымаць у час Твайго другога прыйсьця. Бо Ты — Пачатак нашага ўваскрасеньня, і бесстароньні і чалавекалюбны Судзьдзя тых, што памерлі, Госпад і Ўладар узнагароды, які стаўся ўдзельнікам нашай прыроды дзеля сваёй бязьмежнай прыхільнасьці да нас. Ты дабравольна, у Тваёй вялікай міласэрнасьці ўзяў на сябе ўласьцівыя нашай прыродзе пажаданьні, выставіў сябе на спакусу і пацярпеў, каб быць здольным спагадаць нам і быць памочнікам у нашых спакусах, і ўзьняць нас да ўласьцівага Табе стану непадуладнасьці спакусам.

Прымі, Уладару, нашыя малітвы і просьбы, і супакой душы ўсіх айцоў і матак нашых, і дзетак, родных братоў і сёстраў, і сваякоў, і ўсіх раней памёрлых: запішы імёны іх у кнізе жыцьця, і дай душам іх супакой, у надзеі ўваскрасеньня і жыцьця вечнага, ва ўлоньні Абрагама, і Ісаака, і Якуба, у краіне жывых, у валадарстве нябесным, у раю асалоды; і нас усіх накіроўвай праз Тваіх прамяністых анёлаў да сьвятога жыльля Твайго; і, згодна з Тваім абяцаньнем, узьнімі нашыя целы ў назначаны Табою час. Бо для слугаў Тваіх, Госпадзе, калі яны з целам растаюцца і прыходзяць да Цябе, нашага Бога, няма сьмерці, а толькі пераход ад сумнага існаваньня да салодкага і сьветлага, да супакою і радасьці. Калі ж мы правініліся перад Табою, Ты будзь міласэрны да нас як і да іх, бо ніхто без заганы перад Табою нават праз адзін дзень жыцьця, апрача Цябе, які аб'явіўся нам на зямлі як адзіны бязгрэшны Госпад наш Ісус Хрыстос, праз якога мы ўсе спадзяемся атрымаць міласэрнасьць і адпушчэньне грахоў. Дзеля гэтага, нам як і ім, як добры і чалавекалюбны Бог, разьвяжы, адпусьці і прабач нашыя грахі вольныя і міжвольныя, зробленыя намі сьведама і нясьведама, учынкам, думкаю і словам, і ўсім нашым жыцьцём і дзейнасьцю, вядомыя нам і даўно забытыя. А тым, што ўжо адышлі, даруй вызваленьне і адпушчэньне. Блаславі ўсіх тут прысутных, дай добры і спакойны канец нам і ўсім людзям Тваім, раскрый нам веліч Тваёй міласэрнасьці і чалавекалюбства ў час Твайго страшнага і жахлівага прыйсьця, і зрабі нас годнымі Твайго валадарства.

*(Іншая малітва).* Божа вялікі, усявышні, адзіны несьмяротны, што жывеш у недасяжным сьвятле! Ты ўсё, што існуе, мудра стварыў, аддзяліў сьвятло ад цемры, сонца ўстанавіў, каб кіравала днём, месяц і зоркі — ноччу. Ты ўдастоіў нас, грэшных, у гэтую хвіліну стаць перад Тваім абліччам у духу пакоры і прыносіць Табе вячэрняе хваленьне. Учыні, Чалавекалюбны Ўладару, каб гэтая наша малітва ўзьнялася да Цябе, быццам кадзіла, і прымі яе як адмысловую духмянасьць. Дай, каб гэты вечар і ноч, што неўзабаве настане, былі мірнымі; апрані нас у зброю сьвятла, захавай нас ад страху начнога і ад усякай пагрозы, што крыецца ў цемры. Зрабі, каб наш сон, які Ты даў нам на адпачынак дзеля слабасьці нашай, быў вольны ад д'ябальскіх спакусаў. Так, Уладару, Падаўца ўсяго добрага, дай, каб мы і ўночы, лежачы на ложах нашых, з любоўю ўспаміналі імя сьвятое Тваё; і, прасьветленыя навучаньнем запаветаў

Тваіх, з радаснай душою ўсталі, каб славіць Тваю дабрату, ахвяруючы міласэрнасьці Тваёй малітвы і просьбы за нашыя правіны, і за ўсіх людзей Тваіх, якіх, малітвамі Багародзіцы, наведай у спагадлівасьці Тваёй.

*Усе ўстаюць.*

**Дыякан:** Заступіся, зжалься, збаў і сьцеражы нас, Божа, ласкаю Тваёю.

**Людзі:** Госпадзе, зьмілуйся.

**Дыякан:** Успамянуўшы ўсесьвятую, усячыстую, найблаславёную, слаўную Ўладарку нашу Багародзіцу і заўсёды Дзеву Марыю і ўсіх сьвятых, самі сябе і адзін аднаго, і ўсё жыцьцё наша Хрысту Богу аддайма.

Людзі: Табе, Госпадзе.

Сьвятар: Бо Ты — супакой душ і целаў нашых, і Табе славу аддаем, Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу, цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў.

Людзі: Амін.

Дыякан: Дапоўнім вячэрнюю малітву нашу Госпаду... *І ўвесь далейшы парадак вялікай вячэрні.*

**Вершапесьні**

(*Тон 3*). Сёньня вогненныя языкі явілі знак для ўсіх. Бо гэбрэі, з якіх паводле цела Хрыстос, занядужалі бязьверствам і адпалі ад ласкі Божай; а мы, што паходзім ад паганаў, узмоцненыя словам вучняў, якія прапаведавалі славу Дабранчынца ўсіх Бога, сталіся годнымі Боскага сьвятла. Дык, укленчыўшы і з пакорным сэрцам, умацаваныя Духам Сьвятым, з вераю паклонімся Збавіцелю душ нашых.

*Верш.* Сэрца чыстае ствары ва мне, Божа, і дух правы абнаві ў нутры маім.

Сёньня Дух Пацяшыцель зышоў на кожнае цела, пачаўшы ад збору Апосталаў, і праз іх пашырыў ласку на ўсіх верных. Ён явіў вогненныя языкі як доказ свайго ўладарнага прыйсьця і раздаў вучням розныя мовы, каб на іх хвалілі і праслаўлялі веліч Божую. Дзеля гэтага мы, з прасьветленымі сэрцамі і ўмацаваныя ў веры Духам Сьвятым, молімся за збаўленьне душ нашых.

*Верш.* Не адкінь мяне ад аблічча Твайго і Духа Твайго Сьвятога не адымі ад мяне.

Сёньня апосталы Хрыстовыя апранаюцца ўладаю з вышыні. Пацяшыцель напаўняе іх і тайна абнаўляе розум. І вось яны дзіўнымі мовамі і высокімі словамі навучаюць пакланяцца спрадвечнай і простай існасьці ў трох асобах адзінага Бога і Дабрачынца ўсіх. Дзеля гэтага і мы, прасьветленыя іх навучаньнем, пакланяемся Айцу разам з Сынам і Духам і молімся за збаўленьне душ нашых.

Слава... цяпер...

*(Тон 8).* Прыйдзіце, людзі, паклонімся Богу ў трох асобах... *(Гл. с. 74)*

**Адпушчальны трапар**

*(Тон 8)*. Блаславёны Ты, Хрысьце Божа наш, што рыбакоў напоўніў мудрасьцю, паслаўшы ім Духа Сьвятога, і праз іх улавіў увесь сусьвет. Чалавекалюбча, слава Табе. *(Тройчы)*

**Водпуст.** Хрыстос, праўдзівы Бог наш, які з улоньня Бога і Айца панізіў сябе, зышоўшы з неба на зямлю; прыняў ўсю нашу прыроду і абагавіў яе; а пасьля зноў узышоў на неба і сеў па правай руцэ Бога і Айца; і адтуль паслаў вучням і апосталам сваім Боскага сьвятога, адзінасутнага і роўнасільнага, спрадвечнага і роўнаслаўнага Духа, якім прасьвятліў іх, а праз іх увесь сусьвет, малітвамі ўсячыстае і бязьвіннае сьвятое Маці свае, сьвятых, слаўных, годных пахвалы богапрапаведнікаў і духаносных апосталаў, і ўсіх сьвятых, хай зьмілуецца над намі і збавіць нас, бо Ён добры і Чалавекалюбец.

## ЮТРАНЬ

*Пачатак як у нядзелю Сёмухі (гл. стар. 77). Пасьля другой сядальнай песьні адразу Пс. 50 і каноны Сёмухі.*

*Пасьля Трэцяй песьні канону наступная* ***сядальная песьня:***

*(Тон 8).* Усесьвяты Дух, які зышоў сёньня агнём на апосталаў, жахам напоўніў сэрцы людзей з розных краінаў. Кожны з іх чуў на сваёй мове, як апосталы палымяна прапаведавалі Чалавекалюбца. Для няверных гэты цуд выдаўся ап'яненьнем, а для верных ён быў збаўленьнем. Таму славім дзяржаву Тваю, Хрысьце Божа, і просім паслаць слугам Тваім адпушчэньне грахоў. *(Двойчы)*

*Пасьля шостае песьні канону кандак і ікас, а пасьля дзевятай экзапастыляр Сёмухі.*

**Пахвальныя псалмы**

*(Тон 2).* Праз прарокаў Ты абвясьціў нам шлях збаўленьня... *(Двойчы)*; У доме Тваім, Збавіцелю сьвету... У доме Тваім, Госпадзе, мы верныя... *(Гл. с. 74)*

Слава... цяпер...

*Тон 8).* Некалі, у адказ на дзёрзкі намер будовы вежы... *(Гл. с. 76)*

*Далей Вялікае ўслаўленьне, трапар Сёмухі (Гл. с. 76) і звычайнае заканчэньне сьвяточнай ютрані. Водпуст Сёмухі (с. 76).*

# ЛІТУРГІЯ

*Антыфаны, уваходны верш, трапар і кандак як у дзень Сёмухі. (Гл. с. 83)*

"Сьвяты Божа..."

**Пракімен** (*Пс 27:9,1*). Збаў, Божа, людзей Тваіх і бласлаўі набытак Твой.
*Верш.* Цябе, Госпадзе, клічу: Божа мой, не адмоўчвайся ад мяне.

**Чытаньне лісту сьвятога апостала Паўлы да Эфэсцаў** (*5:8б-19*)

Браты, паступайце, як дзеці сьвятла. Плод Духа ёсьць усякая дабрыня, і праведнасьць, і праўда. Выпрабоўвайце, што мілае Госпаду. Не бярыце ўдзелу ў бясплодных учынках цемры, а лепш выкрывайце іх. Аб тым, што яны робяць таемна, сорамна нават гаварыць; але, выкрытае, яно робіцца бачным у сьвятле. А ўсё яўнае ёсьць сьвятло. Таму і кажацца: "Прачніся ты, што сьпіш, устань з мёртвых, і Хрыстос прасьветліць цябе." Дык уважайце, як паводзіцеся — не як бязглуздыя, але як мудрыя. Выкарыстоўвайце час, бо дні ліхія. Таму ня будзьце неразважнымі, але старайцеся зразумець, што ёсьць воля Гасподняя. Не ўпівайцеся віном, бо ад яго распуста, але поўніцеся Духам, размаўляючы між сабою псалмамі і гімнамі, і духоўнымі песьнямі, пяючы і праслаўляючы Госпада ў вашых сэрцах.

**Алілуя** (*Пс 50:3,13*). Зьмілуйся нада мною, Божа, паводле Тваёй вялікай міласэрнасьці і паводле мноства дабротаў Тваіх ачасьці беззаконьне маё.
*Верш.* Не адкінь мяне ад аблічча Твайго і Духа Твайго Сьвятога не адымі ад мяне.

**Чытаньне Сьвятога Евангельля паводле Мацьвея** (*18:10-20*)

Сказаў Госпад: Глядзіце, не пагарджайце ніводным з гэтых маленькіх, бо кажу вам, што ў небе іхнія анёлы заўсёды бачаць аблічча Айца Майго, што ў небе. Бо Сын Чалавечы прыйшоў каб ратаваць тое, што згінула. Як вам здаецца? Калі нехта мае сто авечак і адна з іх заблудзіць: ці не пакіне ён дзевяцьдзэсят дзевяць у горах і ня пойдзе шукаць адну, што заблудзіла? І калі яму ўдасца знайсьці яе, сапраўды кажу вам, ён цешыцца з яе больш як з дзевяцьдзесят дзевяці, што не заблудзілі. Такім чынам няма волі Айца вашага, што ў небе, каб згінуў адзін з гэтых малых.

Калі брат твой зграшыць супраць цябе, ідзі і выкажы яму аднаму віну ягоную. Калі паслухаецца цябе, дык ты прыдбаў брата твайго. Калі ж не паслухаецца, дык вазьмі з сабою яшчэ аднаго ці двух, каб вуснамі двух або трох сьведкаў пацьвердзіць кожнае слова. А калі не паслухаецца іх, скажы царкве. Калі ж і царквы не паслухаецца, хай табе будзе як паганін ці мытнік.

Сапраўды кажу вам: усё, што зьвяжаце на зямлі, будзе зьвязанае ў небе, а што разьвяжаце на зямлі, будзе разьвязанае ў небе.

Зноў кажу вам: калі двое з вас на зямлі будуць згодна прасіць аб нечым, дык усё дасьць ім Айцец Мой, што ў небе. Бо дзе двое ці трое сабраліся ў Маё імя, там і Я сярод іх.

*Усё іншае, як у дзень Сёмухі.*

## ЗЬМЕСТ

Стар.

*Уступ*......3

**УВАСКРАСЕНЬНЕ ГОСПАДА, БОГА І ЗБАЎЦЫ НАШАГА ІСУСА ХРЫСТА (ВЯЛІКДЗЕНЬ)**
Сьветлая ютрань......5
Літургія......18
Блаславеньне страваў......23
Велікодныя гадзіны......24
Вячэрня ў Велікодную нядзелю......25

**Службы на ўсе дні Сьветлага Тыдня**
Сьветлы Панядзеляк......33
Сьветлы Аўторак......35
Сьветлая Серада......38
Сьветлы Чацьвер......41
Сьветлая Пятніца......44
Сьветлая Субота......46
Малітва на раздрабленьне хлеба ў Сьветлую Суботу......48

**Нядзеля Тамаша**
Вячэрня......49
Ютрань......51
Літургія......56

**Узьнясеньне Госпада, Бога і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста**
Вячэрня......58
Ютрань......61
Літургія......70

**Зыход Сьвятога Духа (Сёмуха)**
Вячэрня......74
Ютрань......77
Літургія......83

**Панядзелак Сьвятога Духа**
Вячэрня......86
Ютрань......93
Літургія......94